Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ВЕРАСНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 172 (27537) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

У знаёмых зламалася пральная машына. Давялося шукаць новую. Купілі, усталявалі, прачыталі інструкцыю па эксплуатацыі і сталі дзейнічаць згодна з ёю. Тут і пачаліся праблемы... СТАР 6

У суботу 14 верасня адбудзецца міжнародная акцыя «Сусветная прыборка — 2013. Зробім!» — своеасаблівы суботнік, што аб'яднае мільёны людзей, якія хочуць зрабіць нашу планету больш чыстай. СТАР 8

«УСЁ ЁСЦЬ ДЛЯ ТАГО, КАБ ПРАЦАВАЦЬ. НА ВЫНІК»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў выбудаваць эфектыўную сістэму адбору і падрыхтоўкі таленавітых спартсменаў у розных відах спорту. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў 12 верасня, наведваючы ў Мінску Гарадскі цэнтр алімпійскага рэзерву па тэнісе, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Тое, як трэба арганізаваць адбор перспектыўных спартсменаў, Прэзідэнт расказаў на прыкладзе тэніса. «Самае галоўнае — гэта сістэма. Нам трэба выбраць паўсотні перспектыўных талковых маладых людзей з тых, хто ёсць, і каб потым хаця б двое-трое змагаліся за самыя высокія месцы ў сусветным рэйтынгу. Мы можам гэта зрабіць, і для такіх маладых людзей і іх трэнераў трэба стварыць ідэальныя ўмовы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў гэты працэс павінны быць уключаны ўсе тэнісныя цэнтры, якія працуюць у Беларусі, не толькі дзяржаўныя, але і прыватныя. Апошнім Прэзідэнт паабяцаў падтрымку, калі яны будуць займацца падрыхтоўкай перспектыўных спартсменаў, у тым ліку на бясплатнай аснове, несучы пэўную сацыяльную нагрузку. «Вядома, падтрымаем, калі чалавек хоча працаваць, укладвае свае грошы. За гэтым справа не стане, мы ім таксама падставім плячо, — сказаў ён. — У нас у гэтым плане няма прыватных, дзяржаўных, усе павінны працаваць на вынік».

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што працэс адбору павінен быць выключна сумленным і грунтавацца менавіта на спартыўным патэнцыяле юных спартсменаў. А тым перспектыўным юнакам і дзяўчатам, чые бацькі не могуць аплачваць прафесійныя заняткі спортам, павінна быць аказана неабходная падтрымка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што і сам гатовы пры неабходнасці ў гэтым удзельнічаць. Ён, у прыватнасці, прапанаваў выкарыстоўваць для трэніровачнага працэсу корты, размешчаныя ў Драздах. «Я гатовы падключыцца, калі патрэбна. Вазьміце самых лепшых, няхай там трэніруюцца, асабліва зімой. У нас у краіне дастаткова інфраструктуры, каб рыхтавацца. Выкарыстоўвайце ўсе рэзервы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што прафесійны ўзровень тэніса ў свеце значна ўзрос, асабліва сярод лідараў у мужчынскім тэнісе. «З імі гуляць вельмі складана, але калі мы выхаваем пару такіх маладых людзей, якія будуць з імі гуляць, — гэта ўжо дасягненне. А ў жаночым тэнісе мы спакойна можам мець дзвюх-трох спартсменак, якія будуць змагацца на ўзроўні Марыі Шарапавай і Вікторыі Азаранка. Проста трэба выбудаваць сістэму», — лічыць Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, адпаведны прынцып неабходна распаўсюдзіць і на іншыя віды спорту: «Усюды трэба з усёй масы выбіраць лепшых». «Усё ёсць для таго, каб працаваць. Адразу скажу, што шалёных грошай мы вам не дадзім, але за вынік заплацім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што калі дзяржава ўкладвае ў падрыхтоўку сродкі, то пэўныя абавязацельствы павінны звязваць і спартсмена. «Каму неабходна, таму трэба дапамагчы. Галоўнае, каб мы мелі з імі кантракты, як на Захадзе, каб яны помнілі, дзе рабілі першыя крокі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандру Лукашэнку далажылі аб стане і перспектывах развіцця тэніса ў Беларусі. Старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская тэнісная федэрацыя» Аляксандр Шакуцін і галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па тэнісе Уладзімір Валчкоў выказалі ўпэўненасць, што сярод маладых тэнісістаў у Беларусі ёсць тыя, хто ў будучым зможа змагацца за высокія месцы. Яны расказалі, што ўжо зроблена ў плане развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы існуючых цэнтраў і папрасілі садзейнічання ў далейшым іх развіцці. У прыватнасці, для арганізацыі паўнацэннага трэніровачнага працэсу трэба пабудаваць яшчэ некалькі крытых кортаў, а асноўныя тэнісныя цэнтры павінны паступова ператварыцца ў акадэміі, на базе якіх будзе наладжаны бесперапынны трэніровачны працэс.

Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька расказаў аб планах будаўніцтва тэніснага цэнтра на тэрыторыі ФАК «Серабранка» па праспекце Ракасоўскага. Для гэтага неабходна $12-15 млн, акупнасць цэнтра складзе 8-10 гадоў. Плануецца, што ён будзе ўключаць 13 крытых тэнісных кортаў, трэнажорную залу і іншую інфраструктуру. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў, каб і да гэтага праекта быў падключаны прыватны бізнес, якому дзяржава ў патрэбны момант можа падставіць плячо.

Мікалай Ладуцька таксама далажыў аб стварэнні ўмоў для заняткаў фізічнай культурай на паркавых і дваровых тэрыторыях Мінска ў цэлым.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай і ўмовамі работы Гарадскога цэнтра алімпійскага рэзерву па тэнісе, арганізацыяй трэніровачнага працэсу, паглядзеў гульню перспектыўных спартсменаў. Цэнтр уключае ў сябе цэнтральны грунтавы тэнісны корт з трыбунамі, шэсць грунтавых тэнісных кортаў, пяць тэнісных кортаў з пакрыццём «хард», міні-футбольнае поле з сінтэтычным пакрыццём, універсальную гульнявую пляцоўку для гульні ў валейбол і баскетбол, трэнажорны гарадок для агульнай фізічнай падрыхтоўкі, дапаможны корпус з адміністрацыйнымі памяшканнямі і трыбунамі.

■ З днём нараджэння, Мінск!

СА СВЯТАМ НЕ РАЗМІНЕШСЯ

У цэнтры ажыве гісторыя, а каля «Заходняга» заспявае Саладуха

Значная колькасць мерапрыемстваў, прымеркаваных да дня нараджэння Мінска, пройдзе 14 верасня на тэрыторыі Верхняга горада, а ўвогуле сёлетні Дзень горада вырашана перанесці з цэнтра ў раёны. Словам, дзе б ні апынуліся жыхары і госці сталіцы, са святам ім не размінуцца. «Мой Мінск — мая сталіца, мой лёс, маё жыццё!» — так гучыць святочны дэвіз.

Па сутнасці, свята распачалося ўжо некалькі дзён таму — Тыднем беларускай кухні, які праходзіць на прадпрыемствах грамадскага харчавання Верхняга горада да 15 верасня. Мясцовыя рэстараны і кавярні на працягу 9 дзён прапануюць 6 нацыянальных страў, прыгатаваных па адзінай тэхналогіі і рэцэптуры — дранікі са смятанай, плато сялянскае, грыбная поліўка, бульбяная бабка, верашчака з грэцкімі блінамі і пячыста са свінога кумпяка. Што асабліва прыемна, кошт кожнай з іх аднолькавы для ўсіх устаноў. СТАР 6

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАБЯКОЎ, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:
«Аналіз кошту аднаго квадратнага метра жылля, пабудаванага па тэхналогіі буйнапанэльнага домабудавання, паказаў, што кошт выдаткаў у двух розных рэгіёнах краіны адрозніваецца значна, і часам у адным горадзе ён у два разы вышэйшы, чым у другім. Чаму, дапусцім, для тыпавога дома ў Мінску для ўзвядзення 1 кв.м плошчы патрабуецца 158 кг цэменту, а ў Віцебску на гэта ідзе 307 кг? Складана зразумець, чаму на адным аб'екце выкарыстоўваецца 38 кг металаарматуры, а на другім — 27 кг, чым гэта растлумачыць?».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.09.2013 г.

Долар ЗША	9030,00	▼
Еўра	12010,00	▲
Рас. руб.	276,50	▲
Укр. грыўня	1105,94	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 16°
Віцебск	+ 19°
Гомель	+ 19°
Гродна	+ 17°
Магілёў	+ 18°
Мінск	+ 17°

■ Падзея

ПЕРШАЯ КЛЯТВА

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Незвычайна шматлюднай была ўчора плошча Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Упершыню каля 130 супрацоўнікаў Следчага камітэта прынеслі тут прысягу на вернасць Радзіме і прафесіі. Сімвалічна, што ўрачысты рытуал адбыўся ў другую гадавіну з дня падпісання кіраўніком дзяржавы ўказа аб утварэнні новага праваахоўнага ведамства.

— Стварэнне Следчага камітэта было абумоўлена неабходнасцю ўдасканалення сістэмы папярэдняга следства, ліквідацыі ведамаснай раз'яднанасці органаў, якія ажыццяўляюць судовую вытворчасць, — зазначыў **старшыня Следчага камітэта генерал-маёр юстыцыі Валянцін ШАЕЎ**. — Сёння можна канстатаваць, што дзяржаве не даводзіцца шкадаваць аб стварэнні новай праваахоўнай структуры. Павышана раскрывальнасць злачынстваў, значна павялічылася кампенсацыя ўрону ад злачынных замахаў. Палепшылася якасць і аператыўнасць папярэдняга следства. Тым не менш мы не павінны спыняцца на шляху ўдасканалення сваёй дзейнасці: яшчэ ёсць значны нявыкарыстаны патэнцыял. СТАР 2

■ Надвор'е

ДАЖДЖЫ І ЦЁПЛА

У пятніцу надвор'е ў нашай краіне будзе вызначацца зонай актыўнага атмасфернага фронту, які рухаецца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.

Таму паўсюдна па Беларусі будуць ісці дажджы. Тэмпература паветра ўдзень ад 13-15 цяпла па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці да плюс 19-21 градуса па ўсходзе краіны. І ў суботу амаль паўсюдна чакаецца воблачнае і дажджлівае надвор'е. Вецер усходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы плюс 7-14 градусаў, удзень — 12-19 цяпла. У нядзелю надвор'е ў рэспубліцы будзе фарміравацца цыклон, які рухаецца ў наш бок з тэрыторыі Украіны. Таму пераважна па поўдні пройдуць дажджы, а вось на поўначы ападкаў не будзе. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю 5-12, удзень — 12-19 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е ў нашай краіне істотна палепшыцца. Дажджоў не будзе ўвогуле, а стане сонечна і цёпла. На працягу першых трох дзён наступнага тыдня тэмпература паветра ўначы будзе ў межах плюс 5-12 градусаў, удзень — 15-20 цяпла. Сіноптыкі прагназуюць, што бліжэй да наступных выхадных надвор'е ў Беларусі сапсуецца зноў.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

25 МІЛЬЁНАЎ ЕЎРАПЕЙЦАЎ ЗБЯДНЕЮЦЬ ДА 2025 ГОДА

Да 2025 года яшчэ 25 мільёнаў еўрапейцаў апынуцца за рысай беднасці. Гэта адбудзецца, калі ўрады краін — членаў Еўрапейскага саюза не спыняць праграмы жорсткіх захадаў эканоміі. У канцы 2012 года статыстычнае агенцтва Еўрапейскага саюза Еўрастат апублікавала справаздачу, згодна з якой 119,6 млн чалавек, што складае 24,2% ад усяго насельніцтва 27 краін Еўрасаюза, знаходзяцца на мяжы крайняй беднасці. Цяжкая сітуацыя назіраецца амаль ва ўсіх краінах Еўрасаюза, але асабліва дрэнна жывецца ў Балгарыі, Румыніі, Латвіі, Літве і Харватыі. У Румыніі і Латвіі на парозе беднасці балансуюць 40% грамадзян, у Літве і Харватыі — па 33%. Але калі брацць не адсоткавыя суадносіны, а непасрэдна колькасць грамадзян краіны, якія перажываюць цяжкасці, горш за ўсё жывецца ў Вялікабрытаніі. Тут з амаль жабрацкімі, па еўрапейскіх мерках, існаваннем вымушаны мірыцца 14 мільёнаў чалавек, або амаль 23% насельніцтва.

ЭФІОПСКІ ФЕРМЕР СЦВЯРДЖАЕ, ШТО ЯМУ НЕ МЕНШ ЗА 160 ГАДОЎ

Новы рэкорд доўгажыхарства можа ўсталяваць жыхар Эфіопіі Дхакабо Эба. Былы фермер, а цяпер пенсіянер сцвярджае, што яму не менш за 160 гадоў. Паводле слоў мужчыны, на сваім вяку ён застаў такія гістарычныя падзеі, як уварванне Італіі ў Эфіопію ў 1895 годзе. «У той час у мяне было дзве жонкі, а мой сын быў досыць дарослым, каб пасвіць буйны статак», — распавёў эфіопец у эфіры мясцовага тэлеканала. На думку рэпарцёраў, Эба памятае некаторыя дэталі, якія даюць падставы яму верыць. Так, у прыватнасці, ён распавядае, што ў дзяцінстве здзейсніў васьмідзённую паездку на кані, каб дабрацца да сталіцы — Адыс-Абебы. Праўда, ніякіх дакументальных пацверджанняў сваіх слоў пенсіянер даць не можа. Ён вырас у грамадстве з вуснай культурай, дзе не існавала дакументаў, якія пацвярджаюць асобу, таму ў яго няма пасведчання аб нараджэнні. Наяўнасць такога дакумента зрабіла б яго самым старым чалавекам з тых, хто цяпер жыве на Зямлі — на 46 гадоў старэйшым, чым дзейны рэкардсмен — 115-гадовая жыхарка Японіі Місаіл Акава, запісаная ў Кнізе рэкордаў Гінеса. Больш за тое, Эба пабіў бы і рэкорд француженкі Жанны Кальман, якая памерла ў 1997 годзе ва ўзросце 122 гадоў і да гэтага часу лічыцца самым старым чалавекам у свеце з тых, хто калі-небудзь жыў на планеце.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДЗЕ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ МІГРАНТАЎ?

Расія заняла другое месца ў свеце па колькасці мігрантаў — на тэрыторыі краіны іх пражывае звыш 11 мільёнаў. Рэкардсменамі па колькасці прыезджых сталі ЗША — там пражываюць 45,8 мільёна замежнікаў, на трэцім месцы знаходзіцца Германія з 9,8 мільёнамі. За ёй ідуць Саудаўская Аравія (9,1 мільёна), ААЭ (7,8) і Вялікабрытанія (7,8). У дзясятак краін таксама ўвайшлі Францыя (7,4 мільёна мігрантаў), Канада (7,3), Аўстралія (6,5) і Іспанія (6,5).

Самыя вялікія патокі мігрантаў перасякаюць мяжу паміж Мексікай і ЗША. У 2013 годзе ў гэтым кірунку прайшлі 13 мільёнаў чалавек. У дзясятцы галоўных міграцыйных калідораў — Расія — Украіна (3,5 мільёна мігрантаў), Украіна — Расія (2,9), Казахстан — Расія (2,5). Усяго ж, згодна з дакладам ААН, у 2013 годзе за межамі роднай краіны пражываюць 232 мільёны чалавек, або 3,2% усяго насельніцтва Зямлі. У Еўропе і Азіі асядае амаль аднолькавая колькасць мігрантаў — 72 і 71 мільён чалавек адпаведна. На гэтыя рэгіёны прыпадае дзве траціны агульнай колькасці міжнародных мігрантаў.

КОРАТКА

Беларусь у СНД з'яўляецца краінай, у якой найбольш чытаюць. На 1 тыс. чалавек насельніцтва ў нас прыпадае 392 карыстальнікі публічных бібліятэк. У Расіі гэты паказчык склаў 375 чалавек, ва Украіне — 336, Азербайджане — 283, Казахстане — 269.

Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола» падала ў УЕФА афіцыйную заяўку на ўдзел у правядзенні фінальнага этапу чэмпіянату Еўропы-2020 у Мінску.

Тарыфы на перасылку простай паштовай карткі, пісьма і бандэролі вагой да 20 г для фізічных і юрыдычных асоб у Беларусі з 13 верасня вырастуць да Br1,6 тыс.

ДАІ не плануе абмяжоўваць рух у Мінску ў Дзень горада 14 верасня.

Гонкі на офісных крэслах упершыню пройдуць у Гомелі падчас святкавання Дня горада 15 верасня. Па ўмовах спаборніцтваў, «вершнікі» павінны прыбыць на старт з уласнымі офіснымі крэсламі, якія маюць моцныя каркасы і колы. Працягласць дыстанцыі складзе 100 м асфальтавай трасы, якая будзе афармлена ў выглядзе офіса. «Вершнікам» трэба будзе пераадолець перашкоды ў выглядзе паненак-сакратарак.

ЯКІЯ АЙЧЫННЫЯ ТАВАРЫ ВАМ ПАДАБАЮЦЦА І Ў ЧЫМ ЯНЫ ПРАЙГРАЮЦЬ ЗАМЕЖНЫМ?

Вячаслаў ПАНЬКОЎ, работнік філармоніі:

— Па прадуктах харчавання пытанняў быць не павінна. Я шмат езджу па Еўропе і магу дакладна сцвярджаць, што беларускія прадукты не горшыя. Праўда, цэны на многія з іх вышэйшыя за еўрапейскія. Хоць некаторыя прадукты і таннейшыя. Наконт адзення, абутку... Безумоўна, ёсць някепскія айчынныя тавары. Напрыклад, «белвестаўскія» чаравікі цудоўныя — шмат гадоў купляю. Але вось учора, дапусцім, я цэлы дзень прабегаў, каб купіць... штаны. Нарэшце перад закрыццём крамы адны ўзяў, аднак без папругі яны не падыходзілі. А нармальнай папругі там не было. Дома з папругай прымераў — усё роўна штаны не падыходзяць, давялося вярнуць. Хоць быццам і матэрыял някепскі. Мо праблема ў маёй фігуры? Маё пажаданне вытворцам: сумленна працаваць, а не проста зарабляць грошы. Каб людзі не пракліналі за тое, што купілі рэч, якая стала ім брыдкай — развалілася ці разарвалася.

Юрый ЖУРБА, спецыяліст тытунёвай кампаніі:

— Што тычыцца харчовых прадуктаў, дык тут беларускія вытворцы выглядаюць някепска. Тыя ж малочныя вырабы лічацца аднымі з лепшых, экспартуюцца ў Расію. А вось тавары лёгкай прамысловасці... З айчынных жонка купляе хіба што прадукцыю фірмы «Серж», падабаецца. Астатняе прывозім у асноўным з Польшчы, Германіі, асабліва вырабы дзіцячага асартыменту — беларускія рэчы ім саступаюць. Не задавальняе і якасць абутку, які можа праз месяц-два разваліцца, хоць цэны еўрапейскія. Пэўна, больш трэба інвеставаць грошай у новае абсталяванне, укараненне сучасных тэхналогій.

Іна НАРКЕВІЧ, журналіст:

— Я купляю беларускія тавары — і адзенне, і абутак, і мэблю. А ў чым многія нашы вытворцы недапрацоўваюць? Лічу, што беларускія тавары, нават калі яны вельмі добрай якасці, саступаюць замежным у дызайне. Так бы мовіць, смачная цукерка, але ў не надта прыгожай абгортцы. Таму хочацца пажадаць айчынным вытворцам крочыць у нагу з часам — больш разнастайнасці, дызайнерскіх знаходак, чагосьці цікавага і адметнага.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

■ Экасфера

«ДЗІРАВІЦЬ» АЗОНАВЫ СЛОЙ ЗАБАРОНЯЦЬ

З 1 студзеня 2020 года Беларусь павінна мець нулявы ўзровень спажывання азонаразбуральных рэчываў. Іх пасля гэтай даты нельга будзе ўвозіць на тэрыторыю нашай краіны.

Пра гэта паведаміў начальнік аддзела рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра і азонавы слой Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Піліпчук.

— Азонаразбуральныя рэчывы, як правіла, выкарыстоўваюцца ў сістэмах пажаратушэння, фітасанітарнай апрацоўкі раслін, кампрэсарных станцыях і кацельных устаноўках. «Пераўзбраенне» ў гэтай сітуацыі будзе справай дастаткова складанай, — адзначыў ён.

Сёлета ў лютым у Беларусі была зацверджана стратэгія па паступовым вывадзе з абарачэння гідрахлоравугляродаў. На праект прадугледжана патраціць 2 мільёны долараў. Гэта звязана з тым, што ў 2012-13 годзе была распрацавана новая рэдакцыя закону аб ахове азонавага слою, якая ўступіць у сілу, верагодна, у лістападзе. Трэба адзначыць, што яшчэ ў 2001 годзе беларускі завод «Атлант» выпускаў халадзільнікі, якія змяшчалі 113-ты фрэон (ён з'яўляецца адным з самых небяспечных для азонавага слою элементаў).

Змены стану азонавага слою шкодзяць чалавеку: выклікаюць аслабленне імуннай сістэмы, павелічэнне колькасці ракавых захворванняў і захворванняў вачэй. Безумоўна, змяняецца і якасць атмасфернага паветра. Вывучаць азонавы слой даследчыкі пачалі каля 35 год таму і заўважылі, што пранікненне ў яго хлору, брому і фтору выклікае разбурэнне і з'яўленне «азонавых дзірак». Ахова азонавага слою на міжнародным узроўні рэгламентуецца Венскай канвенцыяй і Манрэальскім пратаколам. Беларусь адной з першых краін на постсавецкай прасторы падтрымала два гэтыя пагадненні.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

■ Малазнаёмы спорт

КАРФБОЛ І РЫНГА: НАВУЧЫЦЦА НІКОЛІ НЕ ПОЗНА

Прызнайцеся, ці часта ў вас з'яўляецца жаданне падтрымаць сваё здароўе і фізічную форму? Напэўна, дастаткова часта, але, як правіла, кожны раз, каб суцішыць сваё сумленне, знаходзяцца адгаворкі кшталту «на здароўе няма ні часу, ні грошай». Акцыя «Тыдзень здароўя і спорту», якая праходзіць пад дахам «Мінск-Арэны», — выдатная магчымасць гэтую сітуацыю выправіць: дастаткова толькі знайсці час, а грошы вам не спатрэбяцца. На працягу ўсяго тыдня тут праводзяцца бясплатныя майстар-класы па чатырох відах спорту — карфболу, бодзібілдынгу, рынга і стральбе з лазернага пісталета. Вырашылі зазірнуць на «Мінск-Арэну» і мы.

— Акцыя «Тыдзень спорту і здароўя», якая праводзіцца па ініцыятыве Міністэрства адукацыі, стала ўжо традыцыйнай. Яна падтрымліваецца шматлікімі спартыўнымі цэнтрамі не толькі ў Мінску, але і ва ўсёй краіне, — расказала **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Валянціна БАЛЯБА.** — Абсалютна любы ахвотны можа прыйсці на «Мінск-Арэну» і паспрабаваць сябе ў адным з чатырох відах спорту ці адразу ва ўсіх, калі ёсць такое жаданне.

Шмат каго з хлопцаў цікавіць, як праходзяць трэніроўкі па бодзібілдынгу. Адбываюцца яны ў звычайнай трэнажорнай зале. На дзіва, там было і шмат дзяўчат, якія трэніраваліся нараўне з супрацьлеглым полам. Акцыя цікавая і тым, што толькі на пляцоўках «Мінск-Арэны» можна пабачыць, як гуляюць у такія рэдкія віды спорту, як карфбол і рынга. Карфбол у чымсьці нагадвае баскетбол. Але калі баскетбол пабудаваны на перадачах і вядзенні мяча, то карфбол — толькі на перадачах. Такі від спорту вельмі зручны, бо не патрабуе спецыяльна абсталяванай пляцоўкі — у карфбол можна гуляць нават на звычайным полі. А ў некаторых школах, напрыклад, сельскіх, на ўроках фізкультуры вельмі праблематычна сабраць дзве баскетбольныя каманды, у якіх будзе па пяць чалавек. Для карфболу гэта не праблема, таму што ў гэтым відзе спорту дазваляецца збіраць і змешаныя каманды, якія будуць складацца з хлопцаў і дзяўчат.

Яшчэ адзін малазнаёмы для беларусаў від спорту — рынга. Нешта накшталт валейбола — толькі праз сетку перакідваюць не мячык, а кольца. І гульцоў на полі прысутнічае толькі тры. Плюсы гэтай гульні ў тым, што ў ёй могуць удзельнічаць людзі любога ўзросту. Від спорту хоць і не алімпійскі, але спаборніцтвы па ім у Беларусі праводзяцца.

Вялікую цікавасць ва ўдзельнікаў акцыі выклікала і стральба з лазернага пісталета. Тут шэфства над моладдзю ўзяў студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры Павел Шкраб, неаднаразовы прызёр першынства свету сярод моладзі. Павел расказаў, што стральба з лазернага пісталета — гэта адзін з відаў пяцібор'я, а ўвогуле ў пяцібор'е ўваходзяць канкур, фехтаванне, стральба, бег і плаванне. Гэты від спорту — для сапраўдных мужчын.

Падчас акцыі ёсць магчымасць таксама бясплатна пакатацца на каньках. Балазе, штучны лёд дазваляе забыцца, што за сценамі «Мінск-Арэны» «бабіна лета».

Вікторыя ЧАПЛЕВА

■

■ На кантролі

УЛАСНЫЯ МАГУТНАСЦІ «АДПАЧЫВАЮЦЬ», А ІМПАРТ РАСЦЕ

Чаму страчваюць свае пазіцыі айчынныя піваары?

Праблемныя пытанні піваварнай галіны рэспублікі абмеркавалі ў Лідзе на нарадзе з удзелам старшыні камітэта Дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандра ЯКАБСОНА, намесніка прэм'ер-міністра Міхаіла РУСАГА, старшыні Гродзенскага аблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ, кіраўнікоў органаў улады, прадпрыемстваў, міністэрстваў і ведамстваў.

— У многіх краінах піва — гэта добрая альтэрнатыва моцным алкагольным напоям. І да таго ж піваварная галіна з'яўляецца істотнай крыніцай даходаў бюджэту. Летась у бюджэт ад акцызнага падатку па піве паступіў 1 трыльён рублёў, сёлета за паўгоддзе — каля 700 мільярдаў рублёў. Таму для дзяржавы вельмі важна, каб гэтая галіна развівалася эфектыўна, — зазначыў Аляксандр Якабсон.

У апошнія гады сітуацыя на піўным рынку краіны рэзка змянілася ў бок павелічэння вытворчасці, чаму спрыялі зробленыя дзяржавай захады. Створаны сучасныя магутнасці па вырабе піва, якія дазваляюць у поўным аб'ёме забяспечыць не толькі ўнутраныя патрэбы, але і пастаўкі на экспарт. А калі наладзілі вырошчванне піваварнага ячменю і выпуск у неабходных аб'ёмах соладу, гэта дазволіла практычна адмовіцца ад яго імпарту. Ёсць развітая вытворчасць шкляных бутэлек, этыкетак і іншых дапаможных матэрыялаў. Забяспечаны і эканамічныя ўмовы продажу прадукцыі: у прыватнасці, уведзена свабоднае цэнаўтварэнне, дазволена залічваць да затрат рэкламныя і маркетынгавыя паслугі. У галіну прыйшлі буйныя міжнародныя піваварныя карпарацыі.

Здавалася б, усе ўмовы для развіцця айчыннай піваварнай галіны ёсць. Аднак яна не толькі не паляпшае, а апошнім часам страчвае свае пазіцыі. Па выніках мінулага года вытворчыя магутнасці былі выкарыстаны ўсяго на 62% (у параўнанні з 2011-м выраблена 91,5% піва), падзенне вытворчасці назіраецца і сёлета. Беларускія вытворцы слаба займаюцца экспартам, страчваюць свае пазіцыі на ўнутраным рынку, і разам з тым беспадстаўна растуць аб'ёмы ўвозу піва ў краіну. Сёлета імпарт складае каля 30% — гэта анамальна для краіны, якая мае такія буйныя піваварныя прадпрыемствы і мясцовую сыравінную базу, лічыць начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю спажывецкага рынку і сферы паслуг Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Уладзімір КАЛЕНІК.

У нас практычна кожная чацвёртая бутэлька піва — імпартная.
І гэта — пры вялізных уласных магутнасцях, якія «адпачываюць».

Для параўнання: паводле інфармацыі МЗС Беларусі, удзельная вага імпартнага піва ў агульных рэсурсах у Расійскай Федэрацыі летась склала 3,7%, ва Украіне — 1,3%, у Чэхіі — каля 3%, у Польшчы не перавышае 2%. У нас практычна кожная чацвёртая бутэлька піва — імпартная. І гэта — пры вялізных уласных магутнасцях, якія «адпачываюць».

Прычым увозам піва ў рэспубліку займаюцца не толькі кампаніі-імпарцёры, якія на гэтым спецыялізуюцца. «Дапамагаюць» і асобныя айчынныя вытворцы. Напрыклад, беларускімі прадпрыемствамі, што належаць замежным карпарацыям (піўзавод «Аліварыя», піваварні «Хайнекен») летась імпартавана каля 15 працэнтаў ад агульнага аб'ёму ўвезенага піва.

Пры гэтым міжнародныя кампаніі, якія маюць у Беларусі вытворчыя магутнасці, асабліва не напружваюцца развіваць на нашай тэрыторыі выпуск уласных брэндавых марак піва, а ўвозяць іх з Расіі і Украіны, дзе таксама маюць свае заводы. Напрыклад, канцэрн Carlsberg распачаў у нас вытворчасць сваёй маркі «Хольстэн Пілзнер» толькі ў чацвёртым квартале мінулага года. У той час як у краіну працягваецца ўвоз вядомых на беларускім рынку марак піва гэтай карпарацыі: «Балтыка», «Тубарг», «Карлсберг», «Кроненберг» і інш.

— Адбываецца каласальны дэмпінг транснацыянальных карпарацый на беларускім рынку. Яны маюць празмерныя вытворчыя магутнасці ў Расійскай Федэрацыі, ва Украіне і па дэмпінгавых цэнах скідваюць «залішнія» аб'ёмы прадукцыі ў нас. Напрыклад, ёсць факты, калі піва кампаніі «Балтыка» ў Беларусі каштуе на 20-30% менш у параўнанні з Расіяй, дзе яно вырабляецца, — паведаміў старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Аляксандр ЗАБЕЛА.

Пры гэтым карпаратыўныя інтарэсы зусім неабавязкова супадаюць з інтарэсамі канкрэтных работнікаў і рэгіёнаў, дзе размешчаны прадпрыемствы. У прыватнасці, кампанія «Хайнекен» кіравала ў Беларусі дзвюма вытворчымі пляцоўкамі — такая спачатку была стратэгія. Але цяпер іншая: аптымізуючы свае магутнасці, спыняюць вытворчасць у Рэчыцы і пераводзяць абсталяванне ў Бабруйск. Каля 70 работнікаў у Рэчыцы трапляюць пад скарачэнне.

Што датычыцца экспарту, то аб'ёмы яго нязначныя. Прычым замежныя кампаніі ў пытаннях экспарту «адпачываюць» — асноўная нагрузка ўскладзена на дзяржаўныя прадпрыемствы «Крыніца» і «Брэсцкае піва». Пры гэтым апошнім, якое мае найменшыя вытворчыя магутнасці (4,3 млн долараў за год) даводзіцца паказчык па экспарце ў 2,5 раза большы, чым для піўзавода «Аліварыя» (магутнасці — 9,5 млн долараў за год), які належыць інтэрнацыянальнай кампаніі Carlsberg. Больш за тое, ААТ «Брэсцкае піва», выконваючы гэтае заданне, экспартавала піва... са стратамі для сябе.

На нарадзе таксама адзначалася, што патрабуе ўдасканалення акцызная і цэнавая палітыка з мэтай стымулявання продажу піва і скарачэння ўжывання моцных спіртных напояў. Акрамя таго, трэба задзейнічаць вопыт шэрагу еўрапейскіх краін і стварыць эканамічныя ўмовы для развіцця міні-піваварняў, дзе вырабляецца непастэрызаванае, нефільтраванае піва, запатрабаванае ў аматараў гэтага напою. А прадпрыемства «Белсолад» павінна вырабляць не толькі традыцыйную сыравіну для піва, але і для арыгінальных, унікальных гатункаў, выконваючы любы «капрыз» спажыўцоў. Гэтыя і іншыя праблемы піваварнай галіны ўрад і Камітэт дзяржаўнага кантролю пазначаць у сумесным дакуменце, а іх вырашэнне будзе знаходзіцца пад жорсткім кантролем.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ПЕРШАЯ КЛЯТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На сістэмнай аснове следчымі падраздзяленнямі прымаюцца захады па пашырэнні практыкі вызвалення ад крымінальнай адказнасці і прыцягненні да адміністратыўнай адказнасці асоб, што ўчынілі злачынствы, якія не нясуць вялікай небяспекі, і менш цяжкія злачынствы ў сувязі са стратай дзеяння грамадскай небяспекі, раскаяннем і прымірэннем з пацярпелым.

Супрацоўнікі Следчага камітэта прынялі прысягу і ў іншых рэгіёнах краіны. Дарэчы, у гэтую структуру трапляюць выпускнікі следча-экспертнага факультэта Акадэміі МУС, юрыдычных факультэтаў БДУ і ўніверсітэтаў абласных цэнтраў.

— Яшчэ быўшы курсантам Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, цвёрда вырашыў стаць следчым, — прызнаўся **выпускнік Акадэміі МУС 2013 года, следчы першага следчага аддзялення Цэнтральнага раённага аддзела Следчага камітэта горада Мінска лейтэнант юстыцыі Максім ЦЕЦЕРУКОЎ.** — Хоць прафесія гэтая нялёгкая, але высакародная. Мы, маладыя супрацоўнікі, прыняўшы прысягу, узялі на сябе высокія абавязацельствы з гонарам і годнасцю служыць нашай Радзіме. Мы павінны не толькі выкарыстоўваць свае веды на практыцы, а і пераймаць досвед старэйшых таварышаў, захоўваць і памнажаць слаўныя традыцыі органаў папярэдняга следства.

Звяртаючыся да супрацоўнікаў, якія далі клятву на вернасць Радзіме і беларускаму народу, Валянцін Шаеў падкрэсліў, што прысяга павінна стаць маральным арыенцірам на прафесійным шляху. «З моманту прынясення прысягі на вас ускладваецца ўся паўната адказнасці, няўхільнае выкананне абавязкаў па абароне правоў і свабод грамадзян, інтарэсаў грамадства і дзяржавы. Неабходна памятаць, што ад вашага прафесіяналізму, кампетэнтнасці, самаахвяравання, гатоўнасці непрымірыма змагацца з любымі парушэннямі закону ў многім залежыць эфектыўнасць працы Следчага камітэта, яго аўтарытэт і давер народа», — дабавіў кіраўнік сілавога ведамства.

Следчым камітэтам наладжана канструктыўнае ўзаемадзеянне з іншымі праваахоўнымі органамі краіны. Акрамя таго, у межах міжнароднага супрацоўніцтва летась адбыўся шэраг працоўных сустрэч з праваахоўнікамі іншых дзяржаў — прадстаўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў Украіны і Следчага камітэта Расійскай Федэрацыі. Па выніках перамоў з расійскімі калегамі было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Следчымі камітэтамі дзвюх краін.

Вераніка КАНЮТА.

■ Меркаванне

«КАЛІЙНАЯ» СПРАВА: АДДЗЯЛІЦЬ ПРАЎДУ АД ХЛУСНІ

Гаспадарчы канфлікт з крымінальным складнікам, што разгарэўся на калійным рынку пасля аднабаковага выхаду кампаніі «Уралкалій» са складу сумеснага беларуска-расійскага трэйдара «Беларуская калійная кампанія (БКК) пазбаўляецца палітычнай афарбоўкі.

Агрэсіўныя дзеянні алігарха Керымава, скіраваныя на абвал цэн з мэтай захопу кантролю над рынкам, нанеслі значную шкоду не толькі беларускай эканоміцы, але і нямецкім, бразільскім, канадскім, ізраільскім вытворцам калійных угнаенняў. Відавочная шкода таксама нанесена эканамічным інтарэсам Расійскай Федэрацыі, пра што беларускія следчыя ўжо праінфармавалі расійскіх калег. Вядома, што запыты беларускага боку аб аб'яўленні ў вышук як самога алігарха, так і яго падначаленых з ліку расійскіх топ-менеджараў БКК прыняты да разгляду інтэрпалам.

Шэраг расійскіх і замежных чыноўнікаў, экспертаў і журналістаў ад самага пачатку спрабавалі перанесці акцэнты гэтай справы з крымінальнага чынніка да пытанняў палітыкі і ледзь не расійска-беларускіх адносін. Была зроблена спроба стварэння штучнага медыйнага вэрхалу, калі з дапамогай неадпаведных публікацый, «экспертных ацэнак», пагроз, шматлікіх «гучных заяў» у інфармацыйнай прасторы ствараецца паралельная рэальнасць, неадэкватная сапраўднаму ходу падзей. З нафталіну нават дасталі некаторых малавядомых беларускіх палітыкаў, што бавяць асноўны час у эміграцыі, каб апошнія аб'явілі кіраўніка назіральнай рады БКК расійскага грамадзяніна Баўмгертнера «палітычным вязнем сумлення», хоць беларускае следства ў дачыненні да затрыманага расіяніна базуецца выключна на супрацьпраўных фактах эканамічнага характару і злоўжывання службовым становішчам.

Відавочна, што падобныя заявы, якія хлусліва выдаваліся за «пазіцыю Расіі», мелі характар адмысловай правакацыі з мэтай схіліць кіраўніцтва Беларусі да антырасійскіх захадаў і, такім чынам, цалкам крымінальную справу можна было б прадставіць у якасці аднаго з элементаў «русафобскай змовы», што, па задумцы арганізатараў, забяспечыла б нячыстым на руку бізнесменам палітычную падтрымку Крамля.

Дарэчы, досыць нервовае міжнароднае становішча, арганізацыя і правядзенне саміту «вялікай дваццаткі» ў Санкт-Пецярбургу, расійска-амерыканскія супярэчнасці па пытаннях урэгулявання сірыйскага канфлікту дадаткова былі на руку лабістам Керымава: меўся пэўны разлік, што вышэйшае кіраўніцтва Расіі, заклапочанае пытаннямі сусветнай палітыкі, папросту не здолее разабрацца ў віхуры супярэчлівых інфармацыйных патокаў вакол «калійнай справы» і памылкова прыме бок агрэсіўнага капіталу. Майстры інфармацыйнай вайны разлічвалі на лёгкую перамогу ў дачыненні Беларусі, а тое, што іх дзеянні, прадыктаваныя хцівасцю і прагай да нажывы, у выпадку поспеху маглі паламаць геапалітычную стратэгію развіцця рэгіёна Паўночнай Еўразіі, перашкодзіць рэалізацыі амбітных інтэграцыйных планаў, гэта, як кажуць у народзе, «справа дзясятая». Інтарэсы буйнога капіталу ў нашых усходніх суседзяў, на жаль, вельмі часта разыходзяцца з нацыянальнымі інтарэсамі расійскай дзяржавы.

Інтарэсы буйнога капіталу ў нашых усходніх суседзяў, на жаль, вельмі часта разыходзяцца з нацыянальнымі інтарэсамі расійскай дзяржавы.

Беларускі бок у гэтай сітуацыі паводзіў сябе вельмі мудра, каментуючы такую нервовую рэакцыю выключна як асабістае меркаванне некаторых асоб, у той ці іншай ступені блізкіх да структур «Уралкалія». Канфлікт з прыватным капіталам аніяк не паўплываў на айчынную пазіцыю па пытаннях беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў іншых галінах: вайсковай, інтэграцыйнай, эканамічнай. «Сумесныя планы застаюцца недатыкальнымі і мусяць быць рэалізаваны, а «калійная справа» мае выключна гаспадарча-крымінальны характар і належыць да кампетэнцыі адпаведных следчых органаў», — менавіта такая спакойная думка агучвалася як беларускімі дзяржслужбоўцамі і сродкамі масавай інфармацыі, так і прадстаўнікамі незалежнай экспертнай супольнасці.

Падобная рэакцыя беларускага боку дазволіла вышэйшаму расійскаму кіраўніцтву вытрымаць патрэбную паўзу, каб, разабраўшыся, аддзяліць праўду ад хлусні і ўсё ж выказаць меркаванне па факце затрымання грамадзяніна РФ Баўмгертнера і крызіснай сітуацыі на калійным рынку. Напачатку вельмі стрымана выказаўся прэс-сакратар Прэзідэнта РФ Дзмітры Пяскоў, пасля, адказваючы на пытанне журналістаў, разабрацца ў справе «без шуму і гаму» выказаў пажаданне і сам Уладзімір Пуцін.

Нарэшце, як мяркую, канчатковую рысу пад перспектывамі арганізатараў калійнай аферы падвёў саветнік кіраўніка расійскай дзяржавы Сяргей Глазьеў. «Гаспадары «Уралкалія» спрабавалі абваліць рынак з мэтай яго захопу. Калі казаць пра эканамічныя вынікі, то яны цалкам негатыўныя, як для Беларусі, так і для Расіі. Гэта называецца — нядобрасумленная канкурэнцыя», — лічыць чыноўнік.

У расійскіх умовах, з вуснаў саветніка Прэзідэнта, такое меркаванне аб камерцыйнай структуры можа гучаць як прысуд. Прынамсі, дзелавой рэпутацыі. Як бачым, арганізаваны паліттэхнолагамі і інфармацыйнымі кілерамі «шум і гам» не прайшоў. Відаць, расійскія ўлады ўсё ж разабраліся і выказалі адпаведную пазіцыю.

У гэтых умовах не лішнім будзе нагадаць, што афіцыйны Мінск падобнай рэакцыі ад хаўрускіх ніколі не патрабаваў, бо ўвогуле не лічыў «калійны скандал» элементам палітыкі і міждзяржаўных адносін. Рэакцыі ад Крамля патрабавалі, яе адпаведна рыхтавалі і з нецярпеннем чакалі якраз прадстаўнікі алігархічных колаў, блізкіх да Керымава. Як бачым — дачакаліся, але зусім не той, на якую разлічвалі. Выказаная пазіцыя расійскага кіраўніцтва цалкам адпавядае рэальнаму становішчу, інтарэсам беларуска-расійскага збліжэння і нацыянальным інтарэсам Расійскай Федэрацыі, а негатыўная ацэнка дзеянняў кампаніі «Уралкалій» супадае з меркаваннем беларускіх следчых органаў.

Такія падзеі не маглі не адгукнуцца ў бізнес-супольнасці Расійскай Федэрацыі: у колах блізкага да Крамля фінансава-палітычнага істэблішменту папаўзлі чуткі, што Керымаў нібыта прадаў кантрольны пакет акцый «Уралкалія» іншаму ўласніку, абмяркоўваецца нават варыянт нацыяналізацыі прадпрыемства. Як тут не ўспомніць нядаўнюю заяву дырэктара ААТ «Беларуськалій» Валерыя Кірыенкі аб тым, што да беларуска-расійскага ўзаемадзеяння на рынку калійных угнаенняў можна будзе вярнуцца пры ўмове змены ўласніка «Уралкалія»? Між іншым, да пачатку агрэсіўных дзеянняў Керымава сумесны беларуска-расійскі калійны трэйдар быў выгадны абодвум бакам, а таксама задавальняў іншых удзельнікаў калійнай вытворчасці, забяспечваў стабільнасць рынку і коштаў. Відавочна, што зварот да ўзаемадзеяння, нягледзячы на стварэнне беларусамі ўласнага трэйдара, цалкам магчымы і можа быць адным з будучых перспектыўных беларуска-расійскіх праектаў у галіне эканомікі.

Як здаецца, гэтым разам, сутыкнуўшыся з цэнтралізаванай беларускай дзяржавай, агрэсіўны знешні капітал прайграў, прычым прайграў не толькі ў Беларусі, але і ў самой Расіі. Нацыянальныя інтарэсы дзяржаў, патрэбы прадпрыемстваў і працоўных калектываў аказаліся больш важкімі за камерцыйныя памкненні асобных алігархаў. Не выключаю, што сітуацыя вакол «Уралкалія» можа стаць каталізатарам для перагляду ўсіх правіл гаспадарання ў Расійскай Федэрацыі на карысць больш справядлівых і адпаведных народным інтарэсам, калі патрыятычны складнік у дзяржаўным апараце нашых суседзяў канчаткова возьме верх над ліберальна-алігархічнымі кланамі.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ,
дырэктар Інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя»

■

НАВІНЫ

СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў АГУЛЬНЫХ ІНТАРЭСАХ

Дэлегацыя ўрада правінцыі Ганьсу Кітайскай Народнай Рэспублікі пабывала на Гродзеншчыне, каб вызначыць канкрэтныя сферы супрацоўніцтва ў рамках пагаднення паміж гэтымі рэгіёнамі дзвюх краін.

Паводле слоў намесніка дырэктара апарата ўрада правінцыі Ганьсу Юй Цяньніна, ёсць жаданне супрацоўнічаць у сельскагаспадарчым машынабудаванні, хімічнай прамысловасці, а таксама ў сферы культуры і адукацыі. Бліжэйшым часам бакі наладзяць візіты прадпрымальнікаў, творчых дэлегацый. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра прапанаваў кітайскім партнёрам выкарыстаць у агульных інтарэсах геаграфічнае становішча нашага рэгіёна, стварыўшы эканамічную пляцоўку для сумеснай вытворчасці прадукцыі з перспектывай яе экспарту ў рамках Мытнага саюза і ў іншыя краіны, а таксама арганізаваць сумесную гандлёва-лагістычную структуру, узаемадзейнічаць у пытаннях малочнай жывёлагадоўлі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАДЗЕІ

ХРЭСНЫ ХОД НА ВЕЛАСІПЕДАХ

У гонар прападобнага Афанасія, ігумена Брэсцкага, даўно праводзяцца хрэсныя ходы ў Брэсце. На гэты раз хрэсны ход будзе веласіпедным. Як сказана ў прэс-рэлізе Брэсцкай епархіі, такое нетрадыцыйнае царкоўнае шэсце мае выхаваўчы характар, накіравана на прапаганду здаровага ладу жыцця як сярод царкоўнай, так і сярод свецкай моладзі.

Прыкладна 50 веласіпедыстаў стартуюць 13 верасня ад Свята-Афанасьеўскага мужчынскага манастыра ў Брэсце і праедуць да Свята-Праабражэнскага манастыра ў вёсцы Хмелева Жабінкаўскага раёна. На другі дзень іх шлях пройдзе па Кобрынскім раёне, а на трэці дзень, 15 верасня, удзельнікі велапрабегу пачнуць падарожжа ад скіта ў Вяжным Пружанскага раёна і праедуць па Брэсцкім раёне, наведаюць яго храмы. За тры дні падарожнікі пераадолеюць больш за 150 кіламетраў у гонар брэсцкага святога.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СЯМ'Я ЛІДЧАН ПЕРАДАЛА МУЗЕЮ 19 СВАІХ КАРЦІН

«Вытокі» — так называлася выстава карцін трох пакаленняў сям'і Лазоўскіх, якая нядаўна дэманстравалася ў Лідскім гісторыка-мастацкім музеі.

У экспазіцыі былі прадстаўлены работы ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Мікалая Фёдаравіча Лазоўскага, яго дачкі Лідзіі, унучак Ганны і Лідзіі. А па заканчэнні выставы музей атрымаў у падарунак 19 карцін з сямейнай калекцыі. Іх тэматыка цесна звязана з родным краем: пейзажы, помнікі архітэктуры, культавыя будынкі, этнаграфія, фальклор, вызваленне горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў... Гэтыя работы ўвойдуць у выставу «Лідчына розных гадоў у карцінах мастакоў», прымеркаваную да 690-годдзя горада, а таксама ў пастаянную музейную экспазіцыю.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ФАКТЫ

ЗА ПАРУШАЛЬНІКАМІ НАЗІРАЕ ТРАЛЕЙБУС

Запіс на відэарэгістратары тралейбуса дапамог хутка знайсці кіроўцу, які збіў пенсіянера.

У аддзеле прапаганды абласной Дзяржаўтаінспекцыі расказалі, што раніцай на скрыжаванні вуліц Галавацкага і Мазурава ў Гомелі, пры праездзе рэгуляванага пешаходнага пераходу кіроўца аўтамабіля Volkswagen Golf учыніў наезд на 83-гадовага пешахода. Мужчына пасадзіў пацярпелага пенсіянера да сябе ў машыну і адвёз у бальніцу. Але ж пры гэтым «забыўся» пакінуць свае звесткі і знік. Інспектары ДАІ па дазнанні ўважліва прагледзелі запісы відэарэгістратара тралейбуса, які знаходзіўся недалёка ў момант здзяйснення ДТЗ. Дарэчы, у абласным цэнтры ўсе тралейбусы абсталяваны невялічкімі відэакамерамі. Такім чынам і быў знойдзены кіроўца — 26-гадовы жыхар гарадскога пасёлка Новыя Цярэшкавічы Гомельскага раёна. Зараз мужчына можа пазбавіцца правоў кіравання транспартнымі сродкамі на тэрмін да чатырох гадоў.

НАВІНЫ

ПАГАНЯЦЬ МЯЧ ПОБАЧ З ДОМАМ

У Гомелі на базе гімназіі №51 урачыста адкрылася сучасная футбольная міні-пляцоўка са штучным пакрыццём. Плануецца, што любы школьнік не толькі гэтай вучэбнай установы, а і суседніх зможа без усялякіх перашкод паганяць тут мяч — пры любых умовах надвор'я.

Будаўніцтва вялося на працягу двух месяцаў. Фінансавыя сродкі ў памеры каля Br500 млн выдаткаваны адміністрацыяй Савецкага раёна горада і сумесным таварыствам «НТС», якое выступае пастаянным партнёрам праекта па ўзвядзенні футбольных міні-пляцовак па ўсёй Беларусі.

У Беларусі гэта ўжо трынаццаты падобны спартыўны аб'ект, а на Гомельшчыне — чацвёрты. Першая пляцоўка была адкрыта ў Жыткавічах. Сёння яна актыўна выкарыстоўваецца, там праходзяць розныя спаборніцтвы паміж мясцовымі школамі. Старшыня Беларускай федэрацыі футбола Сяргей Румас расказаў, што праект «Родная сторона» — дзецям» пачаўся тры гады таму. Усяго ў рэгіёнах Беларусі плануецца пабудаваць 118 міні-пляцовак. Большасць такіх футбольных палёў адкрываецца дзякуючы падрадчыку кампаніі «Тален Груп», размешчанаму ў Гомелі. Вядома, што яны плануюць пабудаваць у горадзе над Сожам завод па выпуску такіх спартыўных пляцовак. Пры гэтым плануецца вырабляць пакрыцці для розных відаў спорту, а не толькі для футбола.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАДЗЕІ

БРАКАНЬЕР МАСКІРАВАЎСЯ ПАД... ДЗЯРЖІНСПЕКТАРА

Пры правядзенні прыродаахоўнага рэйду на возеры Белае ў Бярозаўскім раёне супрацоўнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі затрымалі двух мясцовых жыхароў, якія на надзіманай лодцы пры дапамозе забароненых прылад лоўлі — васьмі стаўных сетак агульнай даўжынёй 400 метраў — незаконна здабылі больш за 500 асобін розных відаў рыб агульнай вагой 42 кілаграмы.

— У аднаго з парушальнікаў на нагруднай кішэні мелася нашыўка «дзяржаўны інспектар рыбаховы». Яе, як і інспектарскае пасведчанне, а таксама сеткі мужчына набыў у Расіі. Як мяркуецца, туды ж браканьеры збывалі і высушаную рыбу, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслённага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Бярозаўскім РАУС вырашаецца пытанне адносна крымінальнай адказнасці затрыманых за незаконную здабычу рыбы, якая пацягнула нанясенне шкоды прыродзе ў асабліва буйным памеры — 10,8 мільёна рублёў (108 базавых велічынь).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФАКТЫ

ЛЕВЫЯ ЗАПЧАСТКІ

Супрацоўнікі ведамаснага пункта мытнага афармлення «Гомель-Аўта» Гомельскай мытні спынілі спробы незаконнага перамяшчэння праз мяжу запчастак для аўтатэхнікі коштам больш як Br230 млн.

Кантрабанду выявілі пры аглядзе дзевяці кантэйнераў, якія прыбывалі на адрас Гомельскага маторарамонтнага завода, на базе якога працуе сумеснае прадпрыемства па зборцы скутараў. У дакументах, якія суправаджаюць груз, за жнівень не было паказана каля 20 тысяч адзінак запасных частак для мотаролераў. Па фактах парушэння мытнага заканадаўства складзены адміністрацыйныя пратаколы па артыкуле аб незаконным перамяшчэнні тавараў праз мытную мяжу Рэспублікі Беларусь. Незаконна ўвезены тавар канфіскаваны. Матэрыялы адміністрацыйных спраў перададзены ў суд, паведамілі ў прэс-групе Гомельскай мытні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Медыяперсона

Алег СЦЕПАНЮК:

«А ТЭАТР МНЕ ДА ГЭТАГА ЧАСУ СНІЦЦА»

Кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Вядомы вядучы тэлеканала СТБ Алег Сцепанюк — лепшае таму пацвярджэнне. Пасля дваццаці гадоў працы ў тэатры лялек і сямі — на тэлебачанні ён па-ранейшаму імкнецца да дасканаласці і гатовы да новых адкрыццяў...

Разам. (З дачкой Маргарытай і жонкай Валянцінай.)

— Алег, да прыходу на СТБ вы доўга працавалі ў тэатры лялек. Як атрымалася, што з акцёра перакваліфікаваліся ў вядучыя?

— Я чалавек творчы. У прынцыпе, на тэлебачанні працаваў даўно, але... як акцёр. Ва ўсімі любімай «Калыханцы». Так што былі нейкія знаёмствы, напрацоўкі. І калі мне раптам зусім нечакана прапанавалі работу тэлевядучага, я падумаў-падумаў, а потым сказаў сабе: чаму б і не? Прыйшоў, на мяне паглядзелі, мяне паслухалі, далі пачытаць нейкі тэкст. Але калі я праслухаў пасля тое, што начытаў, адразу зразумеў: на гэтым мая кар'ера вядучага скончылася. Уздыхнуў і пайшоў. А праз некаторы час мне патэлефанавалі і спыталі: «А чаму вы не прыходзіце? Мы вас чакаем!». І з гэтага неяк усё і пайшло. Я стаў вядучым, кардынальна памяняў сваё жыццё. Таму што мяне паставілі перад выбарам: альбо тэлебачанне, альбо тэатр. Я зрабіў выбар на карысць тэлебачання і пра гэта не шкадую. Вось ужо сем гадоў.

— Ці складана было прызвычаіцца да тэлевізійнай кухні?

— Так, зусім іншая спецыфіка. Спектакль — гэта спектакль. Ты бачыш гледача, маеш з ім зносіны са сцэны, бачыш яго вочы, рэакцыю — адчуваеш залу. А калі ты садзішся ў кадр у навінах, то там зусім па-іншаму, ты павінен уявіць сабе чалавека, свайго патэнцыйнага гледача, на якога працуеш. Я не хачу проста чытаць навіны, я хачу распавядаць пра іх. Распавядаць людзям, якія сядзяць дома ў тапках, з кубкам кавы... Мне цікава падсумоўваць тое, што было цікавага і важнага ў свеце, у краіне і расказваць пра гэта.

— А досвед працы ў тэатры неяк дапамагае ў прамым эфіры?

— Вы ведаеце, прамы эфір — гэта ўсё ж такі экстрым. Гэта — адрэналін. Ты адчуваеш, што, гэтак жа як і ў тэатры, сотні людзей глядзяць на цябе, слухаюць. Але калі ў спектаклі ты можаш заўтра нешта перайграць, то тут, як вядома, слова — не верабей. А за кожнае слова ты адказваеш. Ты не маеш права дапускаць памылак, бо ўся наша праца (відэаінжынераў, карэспандэнтаў і нават кіроўцаў) замыкаецца на табе... І калі зрабіў нешта не так, уся праца каманды аказваецца марная.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 10.25, 13.50, 18.30, 23.00 Дзённік «ХороШоу».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00 «Нам і не снілася»: «Доктар Фрэйд супраць Госпада Бога».
10.05 «Аўтапанарама».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Слова жанчыне». Серыял.
12.30 «Джэймі: абед за 30 хвілін».
13.00 «Добры дзень, доктар».
13.55 Маст. фільм «Іронія ўдачы».
15.40 «Падманутыя навукай».
16.50 «Па законе».
17.20 «Міншчына».
18.35 «Сакрэты старажытных прыгажунь».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Камедыя «Шчоўкні пальцам толькі раз...».
23.05 «Ежа багоў».
0.00 Еўрапейскі покерны турнір.
0.55 «Халасцякі». Серыял.

МІР

5.00 Серыял «Агонь кахання».
6.40 М/ф.
7.05 «Цік-так».
7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.15 Маст. фільм «9 месяцаў».
11.15, 4.25 «Сардэчна запрашаем».
11.45 «Рэспубліка сёння».
12.25, 2.00 Серыял «Клон».
15.25 Ток-шоу «Яшчэ не разам».
16.20 Серыял «Чорны крумкач».
18.25 Маст. фільм «Хлопчыкі-дзяўчынкі».
20.10 «Любімыя акцёры».
20.40 «Галава клайка»
23.05 Маст. фільм «Партрэт жонкі мастака».
0.40 «Прыгоды Македонскай».
0.55 «Народы Расіі».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Асаблівы выпадак».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.40 Серыял «Мар'ін гай».
13.50, 16.50, 19.50, 22.40 Навіны — Беларусь.
14.25 «1000 дробязяў». Ток-шоу.
15.10 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу
15.55, 17.10 Серыял «Пуцейцы».
18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».
18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
20.45 Маст. фільм «Чаго хочуць мужчыны».
22.50 Маст. фільм «Букет».
0.40 Маст. фільм «Чараўнік».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.55 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.25 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.35 «Справа ўрачоў».
15.35, 18.35 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.40 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.35 Серыял «Брацтва дэсанта».
23.25 Серыял «Карпаў».

8 КАНАЛ

7.00, 12.30, 19.15, 21.05, 23.45 «Надвор'е».
7.05 М/с «Ліга справядлівасці».
7.25, 14.20 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
9.10, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».
10.35 «Мой любімы гадаванец».
11.05, 19.20 Серыял «Падзея».
12.40 Меладрама «Выпадковы муж».
14.10, 23.30 «Кінаблакнот».
16.10 Мультпарад «Легенда пра Тарзана».
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
17.00 Серыял «Тайныя сувязі».
20.30 «Вечарніца».
21.10 Драма «Вялікі Гэтсбі».

ВТБ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00 «PLAY».
8.00, 10.00, 13.00 Сёння.
8.20 Агляд.
8.50 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «З песні слоў не выкінеш!».
14.25 «Следства вялі..».
15.15 «Вочная стаўка».
16.05 «Крамлёўскія дзеці».
16.55 Серыял «Кодэкс гонару».
18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
19.50 Серыял «Вярнуць на даследаванне».
0.50 Камедыя «Масквічы».

8 КАНАЛ

9.00, 13.35, 18.55, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.15 «На рыбалку».
9.30 Серыял «Падзея».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.10 Баявік «Трансфармеры».
13.40 Драма «Маленькі Будда».
15.45, 23.30 «Кінаблакнот».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Фільм — дзецям. Серыял «Прыгоды Шырлі Холмс».
17.25 Серыял «Людзі Альфа».
19.00 Маст. фільм «Вірус».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Ван Хельсінг».

ВТБ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00 «PLAY».
8.00 М/с «Смяшарыкі».
8.30, 10.00, 13.00 Сёння.
8.20 Агляд.
8.50 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «З песні слоў не выкінеш!».
14.25 «Следства вялі..».
15.15 «Вочная стаўка».
16.05 «Крамлёўскія дзеці».
16.55 Серыял «Кодэкс гонару».
18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
19.50 Серыял «Вярнуць на даследаванне».
0.50 Камедыя «Масквічы».

8 КАНАЛ

9.00, 13.35, 18.55, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.15 «На рыбалку».
9.30 Серыял «Падзея».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.10 Баявік «Трансфармеры».
13.40 Драма «Маленькі Будда».
15.45, 23.30 «Кінаблакнот».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Фільм — дзецям. Серыял «Прыгоды Шырлі Холмс».
17.25 Серыял «Людзі Альфа».
19.00 Маст. фільм «Вірус».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Ван Хельсінг».

ВТБ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00 «PLAY».
8.00 М/с «Смяшарыкі».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30 «Спатканне са смакам».
10.00, 17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
10.30, 22.30 «Вясёлыя гісторыі з жыцця».
11.00, 23.00 «Аднакласнікі».
11.30 «Мужчынская праца».
12.00, 21.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 17.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
13.30, 22.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Серыял «Амазонкі».
16.00 «Шлюб без ахвяр».
17.30 «Нерэальная гісторыя».
18.00 «Уральскія пельмені».
20.00 Серыял «Супермакс».
23.30 «Цэнтральны мікрафон».

ІНТЭР+

6.00 Ток-шоу «Шустар Live».
9.30 Смартшоу.
10.00 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
10.45, 22.40 Летняя кухня.
11.30 Маст. фільм «Прыгоды Электроніка».
14.50 Шэф-кухар.
14.55, 1.10 Маст. фільм «З днём нараджэння, каралева!».
16.45 Пазавочы.
17.30, 23.50 Легенды крымінальнага вышуку.
18.00, 0.20 Агенты ўплыву.
18.50 Маст. фільм «Апошняя субота».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30, 3.30 Маст. фільм «Безыменная зорка».
23.25 Цацкі для дарослых.
5.40 Феерыя падарожжаў.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Міжнародная панарама». 1988 год.
6.40, 0.30 «Удовін параход». Фільм-спектакль. 1989 год.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00, 4.00 «Творчы вечар паэта М. Рабініна». 1991 год.
11.00 «Міжнародная панарама». 1988 год.
12.00 «Мелодыі экрана». Фільм-канцэрт. 1984 год.
12.40, 18.35 «Не бойся, я з табой». Маст. фільм.
17.00 «Баўманцы». Дак. фільм. 1979 год.
18.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Кінапанарама».
23.00 «Гэтая пара чароўная». Дак. фільм.
0.05 «Вясёлы калейдаскоп». Фільм-канцэрт. 1977 год.

EUROSPORT

9.30, 12.30, 14.30, 17.30, 1.30 Снукер. Шанхай мастэрс.
13.30, 18.30, 0.30 Веласпорт. Тур Брытаніі.
20.00 Самыя дужыя людзі планеты.
21.00 Бокс. Bigger's Better.
0.00 Коннаспартыўны часопіс.
0.15 Аўтаспартыўны часопіс.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 «Паміж намі».
5.15, 8.05, 2.20 Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
6.15 Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
9.05 Камедыя «Вусаты нянь».
10.20 Камедыя «Банк».
11.15 Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
12.40, 13.55, 15.45 «Камедыянты. Лепшае».
12.55, 16.00, 21.00 Серыял «Як не трэба жыць».
14.10 Камедыя «Здзелка».
17.20 Камедыя «Мой слуга Годфры».
19.20 Камедыя «Беласнежка: помста гномаў».
22.10 Камедыя «Прагнасць».
0.10 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
3.20 Камедыя «Любоўны эліксір № 9».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Фільм-казка «Сямёра салдацікаў».
3.10, 9.10, 15.10 М/с «Кацяня па імені Гаў». Зборнік м/ф. «Зялёны конік». «Казка дзядулі Ай-По». «Белая арэна».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Магія». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Шэрая шыйка». Зборнік м/ф. «Гаспадар вятроў». «Алхімік».
5.00, 11.00, 17.00 Камедыя «Новыя прыгоды капітана Врунгеля». Рускія народныя казкі. «Пра дзеда, бабу і курку Рабу».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Пакахонтас».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Як матылёк вывучаў жыццё». «Дождж». «Хлопчык як хлопчык».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.55 «Ліквідацыя». Серыял.
8.50, 18.30, 2.40 «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
10.45, 17.00 «Паралельны свет». Дак. серыял.
11.45, 16.00 «Варажбітка». Дак. серыял.
12.45, 18.00 «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
13.15 «Шапавалаў». Серыял.
14.15 «Звышнатуральнае». Серыял.
15.05, 1.50 «Менталіст». Серыял.
20.40 «Знаёмства з Факерамі 2». Маст. фільм.
22.30, 4.30 «Без кампрамісаў». Маст. фільм.
0.20 «Жарабец». Серыял.
0.55 «Кліч крыві». Серыял.

ТБ1000

5.00 Драма «Я спакусіла Эндзі Уорхала».
7.00 Трылер «Пастка».
9.00 Трылер «Дзяўчына з вады».
11.00 Драма «Забытыя жаданні».
13.00 Меладрама «Блізкасць».
15.00 Драма «Чароўная краіна».
17.00 Маст. фільм «Аксана ў краіне цудаў».
19.00 Камедыя «Разумнікі».
21.00 Дэтэктыў «У чужым радзе».
23.00 Драма «Дзівосная ласка».
1.15 Трылер «Сачэнне».
3.00 Фільм жахаў «Званок».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Меладрама «Кватарантка».
8.00 Камедыя «Стэп бай стэп».
10.00 Драма «Паўднёвы каляндар».
11.50 Драма «Водпуск у верасні».
14.30 Камедыя «Квактухі».
16.30 Камедыя «Нявеста любой цаной».
18.20 Камедыя «8 першых спатканняў».
20.00 Камедыя «Ушчэнт».
22.00 Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».
0.00 Драма «Адна вайна».
2.00 Камедыя «Мужчынская жаночая гульня».
4.00 Камедыя «Разгільдзяй».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 20.00, 21.00, 0.00, 3.00 Каралі рыбалкі.
6.00 У пошуках акул.
7.00, 10.00 Шымпанзэ: амаль людзі.
8.00, 13.00 Выратавальны атрад.
9.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
11.00, 23.00 Уцёкі.
12.00 Шукальнікі скарбаў.
15.00, 22.00 Злавіць сома.
16.00 Бабровая плаціна.
18.00 Шаша праз пекла.
19.00 Дзікі тунец.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Золата льдоў.
7.50, 12.20, 3.05 Выжыць разам.
8.40, 20.05 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.35, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35, 17.20 Шукальнікі скарбаў Амерыкі.
10.30, 0.00 Загадкі прышэльцаў.
11.25, 3.55 Разбуральнікі легенд.
13.15, 0.55 Top Gear.
14.10, 6.05 Махінатары.
15.05, 18.15 Пятая перадача.
15.30, 21.00, 5.10 Хлопцы з гарматамі.
19.10 Хуткія і гучныя.
22.00 Вулічныя гонкі.
23.00 Мафія амішаў.
1.50 Федэральная паліцыя Аўстраліі.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 21 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.45 Камедыя «Не бядуй!».
8.20 Існасць.
8.50 Слова Мітрапаліта Філарэта на Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10, 17.40 Зямельнае пытанне.
9.35, 23.30 Серыял «Выратаваць боса».
10.45 Здароўе.
11.30 Усё як трэба!
12.15 Камедыя «Кухарка».
13.50 Тайны следства.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зорнае жыццё». «Замуж за іншаземца».
16.30 Каробка перадач.
17.00 Анімацыйны фільм «Дынозаўрык Урмель».
18.35 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
19.15 Меладрама «Аддам жонку ў добрыя рукі».
21.00 Панарама.
21.40 Трылер «Сустрэчнае расследаванне».
23.20 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.50 М/ф «Ілья Мурамец і Салавей-Разбойнік». «Канікулы ў Прастаквашыне».
8.15 Фільм-казка «Вечары на хутары бліз Дзіканькі».
9.25 Пляжны футбол. Чэмпіянат свету. Украіна — Бразілія.
10.35, 20.55 Тэлебарометр.
10.40 Камедыя «Мымра».
12.25 Пад грыфам «Вядомыя».
13.00 Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
13.40, 1.40 Серыял «Таксі».
14.55 Баявік «Улада агню».
16.55 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь. «Шахцёр» — «БАТЭ».
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.15 Цудоўная сямёрка. Вяртанне. Кастынг.
21.00 «КЕНО».
21.05 Баявік «Тры каралеўствы. Вяртанне дракона».
23.05 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Беларусь — Італія.
1.10 Вышэй, чым дах.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 23.45 «Калейдаскоп».
8.05, 10.50, 13.15 «Размовы пра духоўнае».
8.10 «Прыстанак душы».
8.35 «Навагоднія прыгоды ў ліпені». Фільм-казка.
9.50 «Янка Маўр. Капітан дзіцячых мараў». Дак. фільм.
10.25 «Мінск. Таемная вайна». Дак. фільм.
10.55 «Дзень Еўфрасінні». Пра жыццё заступніцы і асветніцы зямлі беларускай.
11.25 «Наперад у мінулае».
11.50 М/ф.
12.10 «Шчырыя прызнанні» Дз. Смольскага». Дак. фільм.
12.50 «Слуцкая анамалія. Ператасаваная гісторыя». Дак. фільм.
13.20 «Зора». Маст. фільм.
15.20 Юбілейны канцэрт Вялікага тэатра Беларусі.
17.05 «Смяротны танец». Дэтэктыў.
20.30 Калыханка.
20.45 Сусветнае кіно. «Ледзяная кветка». Меладрама.
23.00 «Без права на дубль». Вера Халодная. Расплата за славу.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 Серыял «Сінія ночы».
14.05, 16.20 Серыял «Каралеўскае пустазелле».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
18.20 «Адзін супраць усіх».
19.05 «Хвіліна славы. Дарога на Алімп!».
21.05 «Сёння ўвечары».
22.55 «Паспець да поўначы».
23.55 Меладрама «Каханне з перашкодамі».

СТБ

6.05 «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
7.00 «Анфас».
7.15 Камедыя «Шчоўкні пальцам толькі раз...».
9.10 «Чыстая праца».
10.00 «Іншая краіна». «Жывелі, Сербія?».
10.40 «Уявіце сабе».
11.00 «Жанчыны XX стагоддзя». Лайза Мінелі. Жыццё як кабарэ».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.05 «Прыгоды дылетанта».
13.40 Меладрама «Будні і святы Серафімы Глюкінай». 1-я серыя.
15.05 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.30 «Дзіўная справа».
19.30 «24 гадзіны».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 1/2 фіналу Міжнароднага музычнага праекта «ХороШоу».
22.15 Маст. фільм «Марс».
0.05 «Зорны рынг». «Лепшыя візіткі ўдзельнікаў».
1.05 «Глядзець усім!»

МІР

5.00 Дак. фільм «Галівудскія пары».
6.00 М/ф.
8.05 «Мільён пытанняў пра прыроду».
8.20 «Эксперыментатары».
8.35 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «Свет спорту».
9.40 «Даведнік».
10.05 «Зроблена ў СССР».
10.30 Маст. фільм «Прыехалі на конкурс кухары».
11.50, 0.30 Серыял «Амазонкі з глыбінкі».
15.10 Серыял «Шукшынскія апавяданні».
20.40 «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
21.25 Маст. фільм «Занада».
23.00 Маст. фільм «Адкрытае мора».
3.50 «Народы Расіі».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Букет».
8.50 Маст. фільм «Чараўнік».
10.25 «Ранішняя@пошта».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Суботнік».
11.55 «Гарадок».
12.05 Маст. фільм «Няскончаная аповесць».
14.15 «Сумленны дэтэктыў».
14.50 «Пакой смеху».
15.05 «Танкавы біятлон».
16.10 Маст. фільм «Чаго хочуць мужчыны».
18.05 «Суботні вечар».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.45 «Танцы з Зоркамі». Сезон-2013.
0.25 Маст. фільм «Алібі надзея, алібі каханне».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Страхоўшчыкі».
8.00, 10.00, 13.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.20 «Дачны адказ».
11.25 «Паедзем, паядзім!».
11.55 «Цуд тэхнікі».
12.30 «Першая перадача».
13.15 Камедыі «Афраідзіты».
15.00 «Лепшы горад зямлі».
15.45 «Крамлёўскія дзеці».
16.35 «Жыццё і смерць Жэні Белавусава».
17.40 «Ворагі народа».
18.25 Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
19.50 Маст. фільм «Кома».
23.15 «Ягор 360».
23.45 «Луч Света».
0.10 «Школа зласлоўя».

8 КАНАЛ

9.00, 12.15, 19.00, 21.00, 23.35 «Надвор'е».
9.05, 14.45 Мультпарад.
9.30 «Мой любімы гадаванец».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 «Сінематограф». Маст. фільм «Белыя ночы».
12.20 Трылер «Ван Хельсінг».
14.35, 23.20 «Кінаблакнот».
15.20 Серыял «Камісар Рэкс».
17.00 Ток-шоу «Бульбокс».
17.30 Серыял «Людзі Альфа».
19.05 Баявік «Вавілон нашай эры».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Меладрама «Аўгуст Раш».

ВТБ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00 «PLAY».
8.00 М/с «Смяшарыкі».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30, 16.30 Серыял «Асцярожна, дзеці!».
10.30 «Вясёлыя гісторыі з жыцця».
11.00 Серыял «Аднакласнікі».
11.30 «З'ешце гэта зараз жа».
12.00, 23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
13.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 «Жонкі алігархаў».
15.00 Серыял «Супермакс».
17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
17.30 Серыял «Святлафор».
20.00 «Цэнтральны мікрафон».
20.30 «Нерэальная гісторыя».
21.00 «Уральскія пельмені».

ІНТЭР+

6.10, 14.35 Маст. фільм «Прыгоды Электроніка».
9.30 Школа доктара Камароўскага.
10.05, 5.00 Усё для мамы.
10.40, 4.20 Арол і рэшка. Назад у СССР.
11.25 Маст. фільм «Безыменная зорка».
13.30, 5.30 Маст. фільм «Час для роздумаў».
17.55, 6.35 Феерыя падарожжаў.
18.20, 0.05 Легенды крымінальнага вышуку.
18.50, 1.50 Маст. фільм «Хачу вашага мужа».
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
21.30 Маст. фільм «З днём нараджэння, каралева!».
23.20 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
0.35 Маст. фільм «Апошняя субота».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Баўманцы». Дак. фільм.
6.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
6.35, 0.40 «Не бойся, я з табой». Маст. фільм.
8.00, 2.00 «Час».
9.00 «Колба часу».
10.00 «Кінапанарама».
11.00 «Быў час». 2009 год.
12.00 «Музыка супраць СНІДу». Фільм-канцэрт. 1991 год.
13.30 «Ваш выхад!». 1986 год.
15.00 «Вось такая гісторыя...». Маст. фільм.
16.40 «Перапынак». Маст. фільм.
17.00 «Усё тое, што здарылася са мной...». Пра народнага артыста СССР Зіновія Герта. 1994 год.
18.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
19.00 «З песняй па жыцці». Фільм-канцэрт з удзелам Л. Уцёсава. 1971 год.
20.00 «Блакітны агеньчык» «У першую гадзіну...». 1966 год.
21.30 «Ангажэмент. Барыс Рубашкін у Маскве». Фільм-канцэрт. 1990 год.
23.00 «Міжнародная панарама». 1988 год.
0.00 «Мелодыі экрана». Фільм-канцэрт. 1984 год.
4.00 «Творчы вечар паэта М. Рабініна». 1991 год.

EUROSPORT

8.15 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
10.15, 14.15, 20.00 Снукер. Шанхай мастэрс. Фінал.
12.30, 17.30 Скачкі на лыжах. Летні гран-пры.
18.00, 1.00 Веласпорт. Тур Брытаніі.
18.55 Inside the Team.
19.00, 23.30 Аўтаспорт. WEC.
22.00 Бокс. Бой за званне чэмпіёна свету па версіі WBA.
23.15, 2.15 Мотаспартыўны ўік-энд.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 «Паміж намі».
6.00 «Мелодыі экрана». Фільм-канцэрт. 1984 год.
6.40, 12.35 «Не бойся, я з табой». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Творчы вечар паэта М. Рабініна». 1991 год.
11.00 «Баўманцы». Дак. фільм.
12.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама».
17.00 «Быў час». 2009 год.
18.00 «Музыка супраць СНІДу». Фільм-канцэрт. 1991 год.
19.30 «Ваш выхад!». 1986 год.
21.00 «Вось такая гісторыя...». Маст. фільм.
22.40 «Перапынак». Маст. фільм.
23.00 «Чалавек. Зямля. Сусвет». 1981 год.
23.50 «Дайце свету шанц». Фільм-канцэрт. 1988 год.
0.40 «Удовін параход». Фільм-спектакль. 1989 год.

EUROSPORT

9.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
10.15, 14.45, 20.00, 1.30 Снукер. Шанхай мастэрс.
12.30, 17.30, 23.30 Скачкі на лыжах. Летні гран-пры.
18.30, 0.30 Веласпорт. Тур Брытаніі.
22.00 Конны спорт. Global Champions Tour.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 «Паміж намі».
5.15, 12.55, 21.00 Камедыя «Сапернікі-донжуаны, або Гэтыя пакуты кахання».
5.35, 13.10, 21.15 Камедыя «Ноч напралёт».
6.15 Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
7.40, 8.45, 13.50, 16.45, 21.50 «Камедыянты. Лепшае».
8.00, 16.00, 2.20 Камедыя «Паміж двума ліўнямі».
8.15, 16.15, 2.35 Камедыя «Чэмпіён».
9.00 Камедыя «Здзелка».
10.45 Камедыя «Яго перараджэнне».
11.15 Камедыя «Мой слуга Годфры».
14.10 Камедыя «Прагнасць».
17.15 Камедыя «Беласнежка: помста гномаў».
19.20 Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Суседзям уваход забаронены».
22.10 Камедыя «Мноства».
0.10 Камедыя «Вусаты нянь».
1.30 Камедыя «Насільна завербаваны».
3.10 Камедыя «Паміж анёлам і чортам».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Фільм-казка «Казкі старога чараўніка «. 1-я серыя.
3.10, 9.10, 15.10 М/с «Кацяня па імені Гаў». Казкі Пушкіна. «Казка пра залатога пеўніка».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Магія». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Як адзін мужык дваіх генералаў пракарміў». М/ф. «Вясёлая карусель» № 19.
5.00, 11.00, 17.00 Кінааповесць «Дом з прывідамі».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Пакахонтас».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Клубок». «Тры Іваны». «Каралеўскі бутэрброд».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.45, 4.55 «Сябры». Серыял.
11.10 «Знаёмства з Факерамі 2». Маст. фільм.
13.00 «Нявернасць». Маст. фільм.
14.45, 1.40 «Вар'яты». Серыял.
16.45 «Тры багатыры і Шамаханская царыца». М/ф.
18.00 «Прыцемкі». Маст. фільм.
20.30, 3.15 «Фанаграма страсці». Маст. фільм.
22.30 «Пасля прачытання спаліць». Маст. фільм.
0.15 «Жарабец». Серыял.
0.50 «Кліч крыві». Серыял.

ТБ1000

5.00 Камедыя «Разумнікі».
7.00 Драма «Дзівосная ласка».
9.10 Драма «Чароўная краіна».
11.00 Камедыя «Скубі-ду 2: Монстры на волі».
13.00 Маст. фільм «Аксана ў краіне цудаў».
15.00 Трылер «Слепата».
17.10 Трылер «Сачэнне».
19.00 Камедыя «Сэрцаед».
21.05 Фільм жахаў «Званок».
23.10 Драма «Баец».
1.15 Драма «Скарб».
3.15 Камедыя «Кабельшчык».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Драма «Водпуск у верасні».
8.40 Камедыя «Мужчынская жаночая гульня».
10.20 Камедыя «8 першых спатканняў».
12.00 Драма «Маленькая Вера».
14.40 Драма «Заўтра была вайна».
16.15 Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».
18.00 Камедыя «Неадэкватныя людзі».
20.00 Маст. фільм «1812: Уланская балада».
22.00 Трылер «Нас не дагоніш».
0.00 Камедыя «Разгільдзяй».
2.00 Меладрама «Галасы рыб».
4.00 Меладрама «Кветкі ад Лізы».
5.00 Здольнасці малпаў.
6.00 У пошуках акул.
7.00 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
8.00 Злавіць сома.
9.00 Каралі рыбалкі.
10.00 Малпачалавек.
11.00, 12.00, 13.00, 19.00, 20.00, 0.00, 4.00 Гульні розуму.
14.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
15.00 Жан-Мішэль Кусто: акіянскія прыгоды

■ Твае правы

ПРАЛЬНЫЯ ПРЫГОДЫ

У знаёмых зламалася пральная машына. Больш за дзесяць гадоў адпрацавала без рамонтаў. Сям'я была задаволена. Але вось, відаць, тэхніка састарэла і «крэкнула». Давялося шукаць новую, бо без пральнай машыны ж ніяк. Купілі, усталявалі, прачыталі інструкцыю па эксплуатацыі і сталі дзейнічаць згодна з ёю — правялі першае мыццё без адзення, але са сродкам ад накіпу. Тут і пачаліся праблемы...

Барабан змяніў колер — замест бліскучага стаў матавым. Прычым не ўвесь, а нейкімі ўчасткамі. Відавочна, што адбылася хімічная рэакцыя. Хто ведае, паўплывае гэта на працу машыны ці не?.. Зразумела, што знаёмыя спалохаліся: можа быць, гэта брак? У адным сэрвісным цэнтры сказалі, што яны купілі няякасны сродак ад накіпу, у другім — што кідаць гэты сродак увогуле не трэба было, бо накіпу яшчэ няма ў новым барабане. А як жа інструкцыя? Вырашылі звярнуцца да вытворцы. Я прамаўчу пра пісьменнасць спецыяліста аддзелу сэрвісу прадстаўніцтва вытворцы ў Расіі, які адказваў на дасланы па электроннай пошце ліст. Справа ў іншым. Вытворца таксама заявіў, што «я не я, і хата не мая». «Наша тэхніка ўся сертыфікавана. І ўвесь матэрыял, з якога яна зроблена, вельмі добрай якасці. А інструкцыя дадзена для таго, каб спажывец мог сам эксплуатаваць нашу тэхніку. У інструкцыі пазначана, што вытворца РЭКАМЕНДУЕ рабіць ці выкарыстоўваць, але ні ў якім разе НЕ СЦВЯРДЖАЕ, што трэба рабіць менавіта так», — гаворыцца ў адказе. Гэта як зразумець? Атрымліваецца, што інструкцыя — гэта фікцыя? Трэба ўсё рабіць не па інструкцыі, а так, як табе самому захочацца, ці што?

У нас усталяваны дакладны стандарт якасці, а значыць, любая неадпаведнасць гэтаму стандарту ў самым мінімальным пункце будзе недахопам.

Паспрабуй дакажы

«Бывае, што прыходзяць па некалькі чалавек з прэтэнзіямі да адной і той жа фірмы. Дык тут ужо не да закона аб ахове правоў спажыўцоў трэба звяртацца, а да Крымінальнага кодэкса за махлярства», — кажа **Юрый КАВАЛЁНАК, юрысконсульт Мінскага таварыства спажыўцоў.**

— Што ўвогуле рабіць: выбарачна выконваць інструкцыю ці як? Ці з'яўляецца інструкцыя юрыдычным дакументам?

— Натуральна, інструкцыя з'яўляецца юрыдычным дакументам.

— Значыць, тое, што тут напісана, абавязковае для выканання?

— Нельга сказаць, што яна абавязковая. Гэтая інфармацыя вам паведамляецца, і ў выпадку, калі пры невыкананні гэтых правілаў эксплуатацыі пральная машына прыйдзе ў непрыдатнасць і будзе даказана, што парушылі тыя правілы эксплуатацыі, то прадавец у першую чаргу будзе спасылацца на тое, што вы парушылі правілы. Гэта дакладна прапісана і ў законе.

— Такім чынам, калі я рабіў усё згодна з інструкцыяй па эксплуатацыі, то ў любым выпадку праўда будзе мая?

— Вядома. Але калі вас цікавіць пытанне, што ўсё ж такі здарылася з пральнай машынай, то будзе патрэбна экспертыза.

— Па законе павінен рабіць экспертызу прадавец ці вытворца, але яны часцей за ўсё не хочуць гэтага. Што рабіць?

— Вытворца абавязаны будзе зрабіць экспертызу і зробіць, але ў выпадку адсутнасці недахопаў вы павінны будзеце аплаціць яе. Няма такой фармулёўкі: «ці можаце праверыць, ёсць недахопы ці не». Вытворца аддасць у сэрвісную майстэрню, і там, зразумела, скажуць, што недахопаў няма. А патрабаванне экспертызы — гэта сцвярджэнне, што ёсць недахопы.

— А калі разгледзець пытанне агульна: пры любых праблемах з падобнымі таварамі трэба рабіць тое самае?

— Калі ўзнікаюць нейкія праблемы з тэхнічна складаным таварам, то ў першую чаргу трэба звяртацца ці да прадаўца, ці ў сэрвісны цэнтр. У залежнасці ад тавару. Бо гэта можа быць і мабільны тэлефон, і камп'ютар. І правы спажыўца ў розных выпадках розныя. У выпадку, напрыклад, з мабільным тэлефонам часцей за ўсё «ламаецца» аперацыйная сістэма — яе абнаўляюць ці яшчэ штосьці робяць у сэрвіснай майстэрні. Тады прадавец кажа, што гэта не з'яўляецца недахопам. Але ў любым выпадку гэта недахоп, бо тэлефонам карыстацца нельга. У такіх выпадках трэба ісці ў сэрвісны цэнтр і пісаць заяву аб тым, што тавар няякасны і мае пэўныя заганы, ад рамонту адмаўляюся ў сувязі з тым, што тавар няякасны, і патрабую толькі выяўлення прычын узнікнення недахопаў. І калі акажацца, што гэты недахоп не з'яўляецца вынікам няправільнай эксплуатацыі, то можна патрабаваць вяртання грошай ці абмену тавару на новы, належнай якасці. У выпадку з пральнымі машынамі, камп'ютарамі, лядоўнямі і падобнага пакупнік не мае права патрабаваць вяртання грошай. Трэба будзе згаджацца на рамонт. Толькі ў выпадку наяўнасці істотных заган (якія нельга ліквідаваць ці якія выяўляюцца паўторна, або калі кошт іх ліквідацыі перавышае 30% кошту тавару) можна патрабаваць вяртання грошай.



Адказ прадстаўніка вытворцы.

— Яшчэ адно пытанне, якое мяне вельмі хвалюе, — ці можа вытворца казаць, што ў інструкцыі толькі рэкамендацыі, і іх неабавязкова выконваць?

— У гэтым дакументе напісана ўсё літаральна, пакрокава апісана, якім чынам трэба ажыццяўляць першае пранне. Там не напісана «рэкамендуем», а напісана «дабаўляйце сродак ад накіпу». Гэта канкрэтныя правілы карыстання. У такім выпадку вытворца не мае рацыі, бо ён не рэкамендуе. І чалавек, які чытае гэты дакумент, будзе выконваць усё, што там напісана.

— А калі вытворца гаворыць, што ніякіх недахопаў у сваім прадукце не бачыць? Як увогуле зразумець, што ёсць недахоп, а што — не?

— У вытворцаў могуць быць розныя стандарты і ДАСТы. І калі вытворца кажа, што гэта не з'яўляецца недахопам у яго краіне, у нашай краіне гэта можа быць недахопам, бо ў нас іншыя стандарты якасці. І ўлічвацца будуць тыя, якія ёсць у нас. У нас усталяваны дакладны стандарт якасці, а значыць, любая неадпаведнасць гэтаму стандарту ў самым мінімальным пункце будзе недахопам.



Раздзел інструкцыі, дзе напісана, як праводзіць першае пранне.

Па законе

«У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона аб ахове правоў спажыўцоў, у выпадку выяўлення ў працэсе эксплуатацыі заган тавару спажывец павінен накіраваць прадаўцу прэтэнзію з адным з патрабаванняў: замены няякаснага тавару таварам належнай якасці, адпаведнага памяншэння пакупной цаны тавару, неадкладнай бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў тавару, пакрыцця выдаткаў па іх ліквідацыі», — кажа **Алена Быліна, адвакат, член Мінскай гарадской калегіі адвакатаў.**

Яна сцвярджае, што спажывец мае права патрабаваць замены тэхнічна складанага тавару ці дарагога тавару ў выпадку выяўлення істотных недахопаў — тых, якія немагчыма ліквідаваць ці немагчыма ліквідаваць без несувымерных выдаткаў грошай (30 і болей працэнтаў ад кошту тавару, работы ці паслугі) або часу (перавышэнне максімальна дапушчальнай страты часу, якая прадугледжана тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі на ліквідацыю аналагічнага недахопу) ці якія выяўляюцца неаднаразова, ці з'яўляюцца зноў пасля ліквідацыі, ці іншыя падобныя недахопы. Дарэчы, спажывец можа скасаваць дагавор куплі-продажу і запатрабаваць вяртання выплачанай за тавар сумы. Пры гэтым спажывец па патрабаванні і за кошт прадаўца павінен вярнуць атрыманы тавар неналежнай якасці (можна без упакоўкі). Прадавец не мае права ўтрымліваць з выплачаных за тавар грошай, калі іх вяртае, суму, на якую знізіўся кошт тавару з-за поўнага або частковага яго выкарыстання, страты ім таварнага выгляду і да т.п.

Акрамя таго, спажывец мае права звярнуцца з патрабаваннямі аб замене тавару, ліквідацыі недахопаў і інш. да вытворцы. Можна запатрабаваць ад апошняга вяртання выплачаных за тавар грошай, але пры гэтым трэба будзе вярнуць за кошт вытворца тавар неналежнай якасці (можна без упакоўкі). Калі прадавец або вытворцы неплацежаздольныя (банкруты) ці іх дзейнасць спынена, калі ў спажыўца адсутнічаюць дакладныя звесткі аб вытворцы (прадаўцу) ці калі вырабнік знаходзіцца за межамі Беларусі, вы маеце права прад'яўляць усе свае патрабаванні да пастаўшчыка ці прадстаўніка.

Спажывец мае права запатрабаваць неадкладнай бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў тавару ад рамонтнай арганізацыі, упаўнаважанай на ліквідацыю недахопаў тавару падчас гарантыйнага тэрміну.

Варта адзначыць, што адсутнасць у спажыўца дакумента, які пацвярджае факт набыцця тавару, не з'яўляецца падставай для адмовы ў задавальненні патрабаванняў. Для пацвярджэння факта набыцця тавару могуць выкарыстоўвацца паказанні сведкаў, элементы ўпакоўкі, дзе ёсць адзнакі, якія даказваюць, што тавар быў набыты ў гэтага прадаўца, і інш.

Экспертыза

«Пры ўзнікненні паміж спажыўцом і прадаўцом спрэчкі аб наяўнасці заган тавару і прычынах іх узнікнення прадавец абавязаны правесці экспертызу тавару за свой кошт, — сцвярджае адвакат. — Пра месца і час правядзення спажыўца інфармуюць у пісьмовай форме. Калі ў выніку экспертызы выявіцца, што заганы тавару адсутнічаюць ці ўзніклі пасля перадачы тавару спажыўцу праз парушэнне ім пэўных правілаў выкарыстання, захавання, транспартавання тавару ці дзеянняў трэціх асоб або непераадольнай сілы, спажывец абавязаны пакрыць выдаткі на правядзенне экспертызы і звязанымі з ёю выдаткамі на транспартаванне. Спажывец мае права аспрэчыць заключэнне экспертызы тавару ў судовым парадку, а таксама правесці экспертызу за свой кошт».

У выпадку выяўлення недахопаў у гарантыйны тэрмін прадавец адказвае за іх, калі не дакажа, што яны ўзніклі пасля перадачы тавару спажыўцу. Калі гарантыйны тэрмін складае менш за два гады і недахопы тавару выяўлены спажыўцом пасля яго заканчэння, але ў межах двух гадоў з дня перадачы тавару спажыўцу, прадавец адказвае за недахопы тавару, калі спажывец дакажа, што яны ўзніклі да перадачы тавару спажыўцу.

Варта адзначыць, што адсутнасць у спажыўца дакумента, які пацвярджае факт набыцця тавару, не з'яўляецца падставай для адмовы ў задавальненні патрабаванняў.

«Напрыканцы хочацца адзначыць, што пры набыцці тавараў, асабліва тэхнічна складаных, спажывец павінен уважліва азнаёміцца з інструкцыяй па эксплуатацыі, а таксама гарантыйным талонам на тавар, паколькі ў гэтым дакументе пазначаюцца выпадкі, пры якіх вытворцам не прымаюцца прэтэнзіі спажыўца, а таксама выпадкі, пры якіх гарантыя на вырабы не распаўсюджваецца», — адзначае Алена Быліна.

❍❍❍

Адзінае, чаго дамагліся знаёмыя, — спецыяліст з сэрвіснага цэнтра зафіксаваў, што колер барабана змяніўся і што гэта на працу пральнай машыны ніяк не паўплывала. Пры гэтым спецыяліст сам вельмі здзівіўся таму, што было напісана ў інструкцыі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку правядзення экспертызы тавараў (вынікаў выкананых работ, аказаных паслуг), дакладнасці інфармацыі аб таварах (работах, паслугах), зацверджаным Пастановай №26 Савета Міністраў Беларусі ад 14.01.2009 г., экспертызу маюць права праводзіць: акрэдытаваныя органы па сертыфікацыі, акрэдытаваныя выпрабальныя лабараторыі (цэнтры); дзяржаўныя судова-экспертныя ўстановы і асобы, якія маюць спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) на ажыццяўленне дзейнасці па аказанні юрыдычных паслуг з пазнакай паслугі, якая складае ліцэнзаваны від дзейнасці, — судова-экспертная дзейнасць; таварна-прамысловыя палаты — па пытанні якасці тавараў; грамадскія аб'яднанні спажыўцоў. У заяве на правядзенне экспертызы ў кароткай і дакладнай форме фармулююцца пытанні, якія неабходна вырашыць па выніках правядзення экспертызы. Экспертная арганізацыя па ўзгадненні з заяўнікам (дзяржаўным органам па ахове правоў спажыўцоў) вызначае канкрэтны час правядзення экспертызы. Спажывец мае права прыняць удзел у экспертызе асабіста ці праз свайго прадстаўніка.

ГОРАДУ НЕ ПАТРЭБНЫ МІФЫ, КАЛІ ЁН МАЕ ГІСТОРЫЮ

Кнігі — як людзі: кожная мае свой лёс. Мяркую па сваёй бібліятэцы. Адны кніжкі так і засталіся часткай інтэр'еру, нечытанымі. Іншыя ад чужых вачэй хаваю, нікому не даю, бо маніякальна падазраю, што іх «зачытаюць». Ёсць такія экзэмпляры, якімі ад душы дзялюся, лічу лепшым падарункам.

Нешта мне падказвае, кніга Віктара Корбута «Мінск. Лепшы від на гэты горад», якая выйшла ў выдавецкім доме «Звязда», з апошняй катэгорыі: больш не трэба ламаць галаву, што, акрамя цукерак і лёну, дарыць гасцям-замежнікам. Бо гэтая кніга — не проста расказ пра Мінск, а пра горад, паказаны вачыма, учынкамі, працай найцікавейшых яго жыхароў.

Пра тое, што прымусіла ўзяцца за такі адмысловы летапіс горада, спыталася ў аўтара — журналіста і даследчыка Віктара Корбута.

— З 2002 года, — тлумачыць Віктар, — у газеце «Советская Белоруссия» выходзілі мае рэпартажы з раскопак Мінска, інтэрв'ю з гісторыкамі, мастакамі і архітэктарамі, іншымі вядомымі жыхарамі сталіцы. Мне пашчасціла сустрэцца з такімі цікавымі людзьмі, як Май Данцыг, Ілья Курган, Георгій Штыхаў, Адам Глобус, Леанід Левін і яшчэ дзясяткамі, сотнямі тых, хто мне паказаў найлепшы від на гэты горад — той Мінск, які ведалі толькі яны. А зараз адкрыюць для сябе і чытачы.

Гэтую кнігу я пісаў больш за дзесяць гадоў. Так сталася, што спачатку проста ў працэсе журналісцкай работы назапашваліся тэмы, незвычайныя гісторыі, і ўрэшце калегі сталі пытацца, чаму я не пішу кнігі, калі ўжо ёсць столькі цікавага матэрыялу. І сапраўды, на нейкім этапе стала зразумела, што той інфармацыйны масіў, які назбіраўся па ўсіх эпохах жыцця Мінска, патрабуе апрацавання і выдання не толькі ў выглядзе газетных артыкулаў, якія сёння прачытаў і забыў.

У маёй кнізе няма міфаў і апокрыфаў. Гэта даследаванне, заснаванае на дакладных навуковых фактах.

— Віктар, гэтая кніга найперш для саміх мінчан ці «на экспарт», як прынята казаць, для гасцей сталіцы?

— У першую чаргу яна разлічана на мінчукоў. На сваёй скуры я адчуў, што гэта такое — не ведаць свайго горада. У дзяцінстве, калі я жыў на «Шарыках», у Серабранцы, мае сваякі казалі — вось, паедзем «у горад». Гэта значыць — кудысьці на Ленінскі праспект, цяперашні Незалежнасці, у ГУМ, у цырк, у «Бульбяную». І я да нейкага часу проста не ведаў, што ёсць Мінск, які адрозніваецца ад спальных мікрараёнаў майго дзяцінства. І толькі калі ў 1992 годзе мы пераехалі жыць у цэнтр горада, на вуліцу Беларускую, што ля стадыёна «Дынама», я стаў адкрываць для сябе той Мінск, які называюць «горадам Сонца» — з прыгожай архітэктурай. А далей стала цікава: хто жыве ў тых будынках, што памятаюць муры?

Ужо праз два гады пасля пераезду ў цэнтр я правёў першыя ў сваім жыцці археалагічныя раскопкі — на руінах будынка каля Свята-Духавага кафедральнага сабора, там, дзе цяпер фантан. З тых раскопак у мяне да гэтага часу захаваліся дзве знаходкі: кавалкі кафлі з фрагментамі шляхецкага герба і выявай валошкі. Між іншым, на карціне Мая Данцыга, якую я выкарыстаў у якасці вокладкі кнігі, гэты будынак яшчэ відаць.

Я дагэтуль сутыкаюся з думкай, што Мінск зусім новы горад, што ў ім няма нічога старога, як, напрыклад, у найбліжэйшых да нас Вільні, Рызе, Варшаве, Кіеве, Маскве. Але ж, згадзіцеся, нават XX стагоддзе — гэта ўжо гісторыя, і ў ім было шмат чаго цікавага. Хачу адразу сказаць, што ў маёй кнізе няма міфаў і апокрыфаў. Гэта даследаванне, заснаванае на дакладных навуковых фактах. Кожная дэталь з мінулага горада падмацавана інтэрв'ю з археолагамі, гісторыкамі, а што да падзей XX стагоддзя, то і размовамі з іх відавочцамі — вядомымі грамадскімі і культурнымі дзеячамі.

— Вы катэгарычны праціўнік міфаў?

— Гісторыя Мінска багатая. Дык нашто тут нейкія легенды ці міфы? Напрыклад, ёсць будынак, які ў народзе завуць «Пішчалаўскім замкам» — гэта СІЗА № 1 на вуліцы Валадарскага. Між тым, гэта ніякі не замак у рамантычным сэнсе гэтага слова. Кіраўніком будоўлі быў заможны мінчанін Рудольф Пішчала, архітэктарам — Казімеж Хшчановіч. Будынак адразу ставілі як турму, а па імені пана Пішчалы назвалі Пішчалаўскім. Яго спрадвечная назва — «турэмны замак», так у Расійскай імперыі называлі вязніцу.

Таму калі цяпер кажуць, што турму адтуль трэба вывесці і зрабіць невядома што — гэта дыскусійнае пытанне. Але ж не лофты там рабіць для жылля, не офісы. Мо музей турэмнага побыту? Не ведаю. Іншая рэч, што будынак патрабуе пільнай рэстаўрацыі і захавання.

У Ракаўскім прадмесці ёсць хлебазавод. Ён яшчэ дарэвалюцыйны — усё XX стагоддзе там пяклі хлеб. А нядаўна збіраліся знесці... Нашто? Вось ідзеш вуліцамі Віцебскай ці Ракаўскай, а там пахне хлебам — выдатна, прыемна, хай там будзе пякарня, рэстаран, кандытарская. У Мінску гісторыя на кожным кроку!

Тое ж са шпалернай фабрыкай, што на вуліцы Шпалернай. Фабрыка там стаіць больш за сто гадоў. І хай надалей будзе.

— Віктар, мне здаецца, што галоўны міф Мінска — яго месца і год нараджэння. Ці не так?

— Так, ёсць міф аб заснаванні горада. І не адзін! Нібыта жыў нейкі ці то Менеск, ці то Мянеск, які заснаваў горад. Але гэтую легенду, хутчэй за ўсё, прыдумаў журналіст XIX стагоддзя Павел Шпілеўскі. Вядома, горад з'явіўся зусім не ў 1167 годзе, калі адбылася бітва на Нямізе. Гэта проста першае сведчанне пра Мінск у летапісе.

Горад быў заснаваны на беразе Свіслачы. Хаця ёсць версія, што спачатку знаходзіўся за Мінскай кальцавой аўтадарогай, і толькі пасля горад перанеслі на цяперашняе месца. Пра гэтую гіпотэзу і яе верагоднасць я пішу ў самым пачатку кнігі.

— А які, на ваш погляд, галоўны міф пра Мінск XX века?

— Тэма, якая ў грамадстве выклікае шмат увагі дагэтуль, гэта Вялікая Айчынная вайна. Тут таксама не абышлося без «гарадскіх легендаў» — маўляў, Мінск зруйнавала савецкая авіяцыя, нібыта гэта былі планамерныя ўдары. Такія спрэчкі вядуцца не вучонымі, а аматарамі. У маёй кнізе ёсць цэлы раздзел на гэту тэму. Гісторык Ірына Варанкова даследавала пачатак вайны скрупулёзна, па кожным дні, і ў інтэрв'ю адзначыла, у якія будынкі і калі трапілі снарады, бомбы.

Тэма жыцця пад акупацыяй да апошняга часу была закрыта, даследаваліся і асвятляліся партызанская барацьба, падполле. А пра штодзённы побыт горада «пад немцамі» стараліся не пісаць. Гэта былі трагічныя дні. З аднаго боку, знішчаліся будынкі, людзі, а з другога — спроба выжыць, захаваць культурныя каштоўнасці. Я лічу, што гісторыю трэба ўспрымаць як складаную псіхалагічную хроніку чалавечых узаемаадносін і спрабаваць зразумець матывацыі розных людзей.

Як паставіцца да лёсу вядомага мастака Валянціна Волкава? Ён аўтар эскіза Дзяржаўнага герба БССР і вядомай патрыятычнай карціны з выявай уваходу Чырвонай Арміі ў Мінск «3 ліпеня 1944 года». Але ж у час вайны ён застаўся ў акупаваным горадзе, як наогул многія мастакі, удзельнічаў у выставах, што адкрываў Вільгельм Кубэ! Я не знайшоў сведчанняў, што Волкаў у 1941-1944 гады маляваў прапагандысцкія творы, якія ўхвалялі б нацысцкі рэжым. Мо таму пасля вызвалення Беларусі мастак застаўся на волі, яго не арыштавалі, а я прасачыў, як мянялася яго творчасць ужо ў новых умовах. Менавіта такія жыццёвыя гісторыі, лёсы фарміруюць гісторыю горада. Пішучы пра сваіх герояў, я перажываў разам з імі іх лёсы, і вы таксама, чытаючы кнігу, адчуеце гісторыю Мінска «на сваёй скуры».

— Гартаючы кнігу, складваецца ўражанне, што вы збіралі яе, як мазаіку, і атрымалася сапраўды карціна: від на горад. Мяне асабліва зацікавіла вокладка выдання. Чаму вы вынеслі на яе карціны Мая Данцыга?

— Май Данцыг — карэнны мінчук. На сваіх палотнах ён захаваў Мінск, якога ўжо няма: мы бачым будынкі, якія маглі б яшчэ да гэтага часу стаяць. Напрыклад, Халодная сінагога на Нямізе, якая цалкам упісвалася ў новы ракурс горада. Яе знеслі, слядоў не засталося, а на карціне, на якой адлюстраваны бурлівыя змены на Нямізе, будаўніцтва Дома мод, сінагога яшчэ стаіць. На другой карціне Данцыга — мост з праспекта Незалежнасці на вуліцу Маскоўскую. На паласе відаць Дом урада, касцёл у гонар святых Сымона і Алены — той горад, які сфарміраваўся на пачатку XX стагоддзя. Гэта таксама гістарычны Мінск, бо цэнтр горада ў XXI стагоддзі, здаецца, зрушваецца на праспект Пераможцаў.

І яшчэ вярнуся да асобы Данцыга. Дзед Мая Вольфавіча — Герц — меў сваю друкарню на рагу Нямігскай і Камсамольскай вуліц. У жніўні 1917 года, яшчэ пры Керанскім, ён адзіны з мінскіх друкароў згадзіўся надрукаваць першы нумар бальшавіцкай газеты «Звезда» — папярэдніцы цяперашняй «Звязды». Гэта таксама эпізод, які варты захавання ў нашай памяці. І спадзяюся, што газета «Звязда» не пакіне такі цікавы факт без увагі, і на рагу старых вуліц з'явіцца мемарыяльная шыльда ў гонар мастака Мая і яго дзеда Герца.

У кнізе «Мінск. Лепшы від на гэты горад» многа фактаў, пра якія маўчаць энцыклапедыі і падручнікі. Але без гэтых фактаў, кажучы словамі вядомага расійскага журналіста Леаніда Парфёнава, «нас немагчыма ўявіць, яшчэ цяжэй — зразумець».

Ларыса РАКОЎСКАЯ.

СА СВЯТАМ НЕ РАЗМІНЕШСЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Каб закахацца ў родны горад канчаткова і беспаваротна, трэба паглядзець на яго з вышыні, — падумаў наш калектыў. І з вышыні палёту верталёта была зроблена фантастычнай прыгажосці фотасесія, якую можна ўбачыць на старонках газет «Минский курьер» і «Вечерний Минск», — расказвае **генеральны дырэктар агенцтва «Минск-Новости» Кацярына ДУБІНСКАЯ.** — Пабачыць фотаздымкі, атрымаць як мага больш поўную інфармацыю пра святкаванне Дня горада можна ў нумарах газет за 12 і 13 верасня.

Гісторыя свята паходзіць з 2001 года, калі другія выхадныя верасня пачалі лічыцца Днём горада Мінска, якому сёлета спаўняецца 946 гадоў.

Калі сказаць коратка, мінчане атрымалі сёлета ў падарунак шэраг новых і рэканструяваных сацыяльных аб'ектаў. На жаль, сярод іх пакуль няма вельмі маштабных адкрыццяў, але ўсё яшчэ наперадзе. На лістапад, скажам, запланавана адкрыццё гандлёва-забаўляльнага спартыўнага комплексу «Чыжоўка».

У выязным гандлі возьмуць удзел звыш 600 гандлёвых арганізацый і аб'ектаў грамадскага харчавання. Гандаль разгорнецца на больш як 30 пляцоўках горада ў месцах правядзення культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў. Шэраг буйных крам парадуюць пакупнікоў зніжкамі.

Вядома, мінчанам хочацца, каб у іх горадзе былі нейкія асаблівыя, «фірмовыя» падзеі. Думаю, што гэта можа быць свята «Мінск гістарычны» з удзелам прадстаўнікоў рыцарскіх клубаў, якое адбудзецца на праспекце Пераможцаў з 11.30 да 22.00. Менавіта гэта падзея будзе праходзіць другі раз, і сёлетняя адметна тым, што да яе рыхтаваліся амаль цэлы год. Плануецца аднавіць і атмасферу сярэднявечча, і гераічную абстаноўку часоў Першай і Другой сусветных войнаў.

Наогул пачнуцца ўрачыстасці ўскладаннем а 11-й гадзіне кветак да абеліска «Мінск — горад-герой». Далей будуць закрыццё летняга турыстычнага сезона ў Верхнім горадзе «Музычны балкон», канцэрт «Музыка ў гарадскім інтэр'еры», кніжная выстава, дзіцячы мастацкі пленэр, ля Мінскай гарадской ратушы — музейная экспазіцыя «Картаграфічны кабінет», на любімай ужо многімі пешаходнай зоне вуліцы К. Маркса — фінал тэатральнага праекта, урачыстая цырымонія яго закрыцця. На тэрыторыі комплексу «Студэнцкая вёска» — свята «Мінск моладзевы».

Сярод элітных мерапрыемстваў варта адзначыць падвядзенне ў Палацы прафсаюзаў вынікаў конкурсу «Мінскі майстар». 40 лепшых па прафесіі — гэта і токар, і маляр, і вадзіцель аўтобуса, і швачка, і афіцыянт, і бібліятэкар і г.д. — атрымаюць з рук мэра горада дыпломы і каштоўныя падарункі. А ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета адбудзецца ўручэнне ўзнагарод «Мінчанам года». Імёны гэтых мінчан трымаюцца, вядома, пакуль у сакрэце. Паколькі на саму цырымонію можна будзе трапіць толькі па запрашэнні, для ўсіх іншых на плошчы ля тэатра будзе арганізаваны творчы праект у 3D-фармаце — у 21.30, 22.00, 22.30 і 23.00. У хуткім часе партрэты мінчан, якімі можа ганарыцца сталіца, з'явяцца на білбордах. Дарэчы, гучных імён сёлета фактычна няма, гэта проста дастойныя людзі, хоць пакуль і не вядомыя.

